ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
29.07.2025 № 134

# Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для V–IX класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» (далей – вучэбная праграма) прызначана для вывучэння вучэбнага прадмета «Беларуская мова» ў V–IX класах устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана: у V–VI класах на 105 гадзін (3 гадзіны на тыдзень), VII–VIII класах на 70 гадзін (2 гадзіны на тыдзень), IX класе – на 68 гадзін (2 гадзіны на тыдзень).

3. Мэта навучання беларускай мове – фарміраванне ў вучняў сістэмы ведаў пра мову і маўленне, навыкаў выкарыстання беларускай мовы ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці (чытанне, слуханне, гаварэнне, пісьмо); развіццё камунікатыўнай, духоўна-маральнай, грамадзянскай і мастацка-эстэтычнай культуры вучняў.

4. Задачы:

моўнае і маўленчае развіццё вучняў на аснове засваення ведаў аб сістэме беларускай мовы на ўсіх яе ўзроўнях (фанетычным, лексічным, граматычным); валоданне нормамі беларускай літаратурнай мовы (арфаэпічнымі, акцэнталагічнымі, лексічнымі, фразеалагічнымі, словаўтваральнымі, марфалагічнымі, сінтаксічнымі, арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі), правіламі функцыянавання моўных сродкаў у маўленні, развіццё ўменняў карыстацца мовай у розных відах маўленчай дзейнасці;

фарміраванне і развіццё камунікатыўных уменняў ствараць самастойныя выказванні розных тыпаў, стыляў і жанраў маўлення ў вуснай і пісьмовай формах на прапанаваную і самастойна выбраную тэму на аснове авалодання маўленчай тэорыяй і культурай маўлення, спосабамі перадачы думкі ў вуснай і пісьмовай формах;

фарміраванне маўленчай культуры вучняў на аснове засваення мовы як формы выражэння нацыянальнай культуры, узаемасувязі мовы і гісторыі народа, нацыянальна-культурнай спецыфікі беларускай мовы; развіццё здольнасці карыстацца культуралагічнымі звесткамі для забеспячэння паўнавартаснай камунікацыі;

фарміраванне сродкамі беларускай мовы сістэмы агульначалавечых і нацыянальных ідэалаў, традыцый, звычаяў, каштоўнасцей беларускага народа, норм, якія рэгулююць паводзіны асобы ў грамадстве.

5. На вучэбных занятках рэкамендуецца выкарыстоўваць разнастайныя метады навучання і выхавання: гутарку, самастойную работу, наглядныя метады, выкананне практыкаванняў, практычных работ і іншыя метады. З мэтай актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў выкарыстоўваюцца метады праблемнага навучання, інтэрактыўныя, эўрыстычныя, гульнявыя метады, дыскусіі, метад праектаў і іншыя метады.

Мэтазгодна спалучаць франтальныя, групавыя, парныя і індывідуальныя формы навучання, выкарыстоўваць такія віды ўрокаў, як урок-даследаванне, урок-практыкум, урок-экскурсія, урок-гульня, інтэграваны ўрок і іншыя віды ўрокаў.

Выбар форм і метадаў навучання і выхавання вызначаецца педагагічным работнікам самастойна на аснове мэт і задач вывучэння пэўнай тэмы, сфармуляваных у вучэбнай праграме патрабаванняў да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў з улікам іх узроставых і індывідуальных асаблівасцей.

Работа па развіцці маўлення арганізуецца на кожным уроку, пры вывучэнні ўсіх раздзелаў і тэм курса беларускай мовы. Вучэбная праграма прадугледжвае гадзіны толькі на пісьмовыя кантрольныя і навучальныя работы, на напісанне якіх адводзіцца асобны ўрок (асобныя ўрокі).

Прыкладныя віды дзейнасці, якія мэтазгодна выкарыстоўваць на вучэбных занятках па беларускай мове:

чытанне тэкстаў, вызначэнне асноўных прымет тэксту (тэматычнае адзінства, разгорнутасць, паслядоўнасць, звязнасць, завершанасць); выяўленне спосабу і сродкаў сувязі сказаў і частак тэксту;

чытанне і аналіз тэкстаў розных стыляў, абгрунтаванне выбару моўных сродкаў у іх; выяўленне ў тэкстах вывучаных моўных адзінак, вызначэнне іх сэнсава-граматычнай і стылістычнай ролі ў тэкстах;

выкананне розных відаў навучальных і кантрольных работ (дыктантаў, пераказаў, перакладаў, сачыненняў, тэставых работ і іншых відаў);

складанне вучэбных паведамленняў на аснове матэрыялаў вучэбнага дапаможніка (табліц, схем, алгарытмаў), складанне плана тэксту, тэзісаў, канспекта; самастойнае складанне табліц, схем, алгарытмаў, апорных канспектаў для абагульнення і сістэматызацыі вывучанага матэрыялу (пад кіраўніцтвам педагагічнага работніка);

удзел у дыспуце на маральна-этычную тэму;

напісанне самастойных тэкстаў пэўнага стылю і жанру, тэкстаў на адну тэму ў розных стылях;

рэдагаванне тэкстаў розных стыляў, знаходжанне і выпраўленне маўленчых недахопаў, арфаграфічных, пунктуацыйных і граматычных памылак.

6. Да прадметных вынікаў вучэбнага прадмета «Беларуская мова» адносяцца моўная, маўленчая, камунікатыўная, лінгвакультуралагічная і сацыякультурная кампетэнцыі.

Моўная кампетэнцыя – валоданне ведамі аб сістэме мовы на ўсіх яе ўзроўнях (фанетычным, лексічным, граматычным), правіламі функцыянавання моўных сродкаў у маўленні; нормамі літаратурнай мовы.

Маўленчая кампетэнцыя – валоданне спосабамі перадачы думкі

сродкамі мовы ў вуснай і пісьмовай формах, уменнямі карыстацца мовай у розных відах маўленчай дзейнасці.

Камунікатыўная кампетэнцыя – валоданне вучнямі культурай маўлення, правіламі маўленчых зносін і рознымі відамі маўленчай дзейнасці; сфарміраванасць уменняў ствараць самастойныя вусныя і пісьмовыя выказванні розных тыпаў, стыляў і жанраў у адпаведнасці з мэтамі і задачамі зносін.

Лінгвакультуралагічная кампетэнцыя – усведамленне вучнямі мовы як феномена культуры, у якім знайшлі адбітак яе праяўленні, засваенне нацыянальна маркіраваных адзінак беларускай мовы, развіццё здольнасці адэкватна ўжываць іх у маўленні, авалоданне мовай як сістэмай захавання і перадачы каштоўнасцей культуры.

Сацыякультурная кампетэнцыя – засваенне сацыяльных норм маўленчых паводзін, культурных каштоўнасцей беларускага народа і агульначалавечых каштоўнасцей, ідэалаў, традыцый, звычаяў, якія рэгулююць узаемадзеянне і паводзіны людзей у грамадстве, фарміраванне здольнасці карыстацца культуразнаўчымі звесткамі ў працэсе маўленчых зносін, развіццё сродкамі мовы інтэлектуальнай, камунікатыўнай, духоўна-маральнай, грамадзянскай культуры вучняў.

Да метапрадметных вынікаў асваення зместу вучэбнага прадмета «Беларуская мова» адносяцца гатоўнасць вучня да вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, засваенне ўніверсальных вучэбных дзеянняў і міжпрадметных паняццяў, у тым ліку:

ажыццяўленне прыёмаў разумовай дзейнасці на адпаведным узроставым асаблівасцям узроўні: уменне аналізаваць і сінтэзаваць, аперыраваць паняццямі, рабіць абагульненні, устанаўліваць аналогіі і прычынна-выніковыя сувязі, класіфікаваць, рабіць вывады і падагульненні;

здольнасць пісьменна і аргументавана выкладаць свае думкі ў вуснай і пісьмовай форме; адстойваць і абгрунтоўваць свой пункт гледжання;

уменне свядома выкарыстоўваць маўленчыя сродкі для ажыццяўлення камунікацыі;

наяўнасць сфарміраваных навыкаў усвядомленага чытання тэкстаў розных стыляў і жанраў;

уменне выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі з вучэбна-пазнавальнымі мэтамі, працаваць з тэкставай і графічнай інфармацыяй, вылучаць галоўнае; рацыянальна і бяспечна выкарыстоўваць інфармацыйныя камунікацыйныя тэхналогіі пры рашэнні рознага роду задач; крытычна ацэньваць і інтэрпрэтаваць інфармацыю, якая змяшчаецца ў розных крыніцах;

праяўленне цікавасці да вучэбна-даследчай і праектнай дзейнасці, здольнасць і гатоўнасць да самастойнай творчай дзейнасці.

Да асобасных адукацыйных вынікаў належаць: валоданне беларускай

мовай як сродкам пазнання свету, далучэння да культуры як сістэмы каштоўнасцей і норм паводзін; валоданне пачуццём патрыятызму, грамадзянскасці; захаванне нацыянальнай ідэнтычнасці ў полікультурным соцыуме; дэманстрацыя ўстойлівай цікавасці да самастойнай дзейнасці, самапазнання, самаразвіцця; здольнасць да супрацоўніцтва і камунікацыі ў розных сітуацыях і ўмовах маўленчых зносін.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

### V клас
### (105 гадзін на год, 3 гадзіны на тыдзень; з іх 16 – гадзін на кантрольныя і навучальныя пісьмовыя работы, на напісанне якіх адводзяцца асобныя ўрокі; 2 гадзіны рэзервовыя)

#### Мова – найважнейшы сродак зносін
#### (1 гадзіна)

Чалавек і мова. Камунікатыўная функцыя мовы.

Віды дзейнасці: чытанне і слуханне вучэбных тэкстаў, вызначэнне іх тэмы, адрасата і мэтанакіраванасці; складанне пытанняў да тэкстаў, падрыхтоўка вусных і пісьмовых адказаў на іх; стварэнне ўласных выказванняў на аснове зместу тэкстаў і малюнкаў; паведамленне на тэму «Роля мовы ў жыцці чалавека».

#### Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

ролю мовы ў жыцці чалавека і грамадства, асноўную функцыю мовы.

Умець:

успрымаць тэкст на слых і пры чытанні; выразна, у адпаведнасці з нормамі літаратурнага вымаўлення чытаць тэкст, вызначаць яго тэму, адрасата і прызначэнне; пераказваць змест тэкстаў і ствараць уласныя выказванні на тэму «Роля мовы ў жыцці чалавека».

Валодаць:

вывучанымі нормамі беларускай літаратурнай мовы пры пераказе зместу тэкстаў і стварэнні ўласных выказванняў.

#### Маўленне
#### (4 гадзіны)

Вусная і пісьмовая формы маўлення. Віды маўленчай дзейнасці: слуханне, чытанне, гаварэнне, пісьмо. Умовы, неабходныя для ўспрымання і стварэння выказвання.

Стылі маўлення: мэта і сфера выкарыстання.

Мастацкі, навуковы і гутарковы стылі маўлення: мэта, сфера выкарыстання, моўныя асаблівасці.

Віды дзейнасці: чытанне тэкстаў, вызначэнне іх стылю, мэты і сферы выкарыстання; назіранне за тэматычна аднароднымі тэкстамі, вызначэнне маўленчай сітуацыі, у якой кожны з іх выкарыстоўваецца; удзел у розных відах маўленчай дзейнасці (слуханне, чытанне, гаварэнне, пісьмо); стварэнне паведамленняў на лінгвістычную тэму на аснове схем, табліц; аналіз і стварэнне тэкстаў мастацкага, навуковага і гутарковага стыляў.

## Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

формы маўлення, віды маўленчай дзейнасці; прыметы маўленчай сітуацыі; характэрныя прыметы мастацкага, навуковага і гутарковага стыляў маўлення.

Умець:

адрозніваць вусную і пісьмовую формы маўлення; выяўляць прызначэнне тэкстаў, іх адрасата і мэтанакіраванасць; вызначаць стыль тэкстаў (гутарковы, мастацкі, навуковы); аналізаваць тэксты і ствараць уласныя выказванні гутарковага, мастацкага і навуковага стыляў.

Валодаць:

вывучанымі нормамі беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні ўласных выказванняў гутарковага, мастацкага і навуковага стыляў.

## Паўтарэнне вывучанага ў I–IV класах
(11 гадзін)

Назоўнік. Род, лік, склон назоўнікаў. Змяненне назоўнікаў у адзіночным і множным ліках.

Прыметнік. Сувязь прыметніка з назоўнікам. Асаблівасці змянення прыметніка па родах, ліках і склонах.

Займеннік. Асабовыя займеннікі, іх змяненне.

Дзеяслоў. Неазначальная форма дзеяслова. Правапіс не з дзеясловамі. Часы дзеяслова. Змяненне дзеясловаў па асобах і ліках, правапіс канчаткаў. Змяненне дзеясловаў прошлага часу па родах, правапіс канчаткаў.

Віды дзейнасці: выяўленне вывучаных часцін мовы ў сказах, тэкстах, вызначэнне іх граматычных прымет; параўнанне назоўнікаў, род і лік якіх у беларускай і рускай мовах не супадаюць; падбор прыметнікаў да

назоўнікаў, дапасаванне іх у патрэбным родзе, ліку і склоне; змяненне дзеясловаў па асобах і ліках; стварэнне паведамленняў на лінгвістычную тэму пра часціны мовы на аснове табліц і схем; пераклад апавядальнага тэксту з рускай мовы на беларускую, выяўленне адрозненняў у перадачы моўных сродкаў.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

граматычныя прыметы вывучаных часцін мовы.

Умець:

правільна вымаўляць гукі пры чытанні, знаходзіць націскныя склады ў словах; распазнаваць часціны мовы (па агульным значэнні і пытанні); змяняць часціны мовы, правільна пісаць канчаткі; перакладаць з рускай мовы на беларускую апавядальныя тэксты, выяўляць адрозненні ў перадачы моўных сродкаў.

Валодаць:

вывучанымі нормамі беларускай літаратурнай мовы пры перакладзе апавядальнага тэксту з рускай мовы на беларускую і стварэнні ўласных паведамленняў на лінгвістычную тэму.

Тэкст
(5 гадзін, з іх 1 гадзіна – на кантрольную пісьмовую работу)

Тэкст. Прыметы тэксту: тэматычнае адзінства, паслядоўнасць, звязнасць (спосаб сувязі, сродкі сувязі). План тэксту.

Тыпы маўлення: апавяданне, апісанне, разважанне (прызначэнне і будова).

Кантрольны дыктант.

Віды дзейнасці: чытанне і слуханне тэкстаў, вызначэнне іх прымет, выяўленне спосабу і сродкаў сувязі сказаў у тэксце; складанне плана, пераказ тэксту на аснове плана; аналіз і складанне схем тэкстаў розных тыпаў маўлення; складанне ўласных выказванняў розных тыпаў; запіс тэксту пад дыктоўку.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

прыметы тэксту, спосаб і сродкі сувязі сказаў у тэксце; прызначэнне і будову тыпаў маўлення.

Умець:

вызначаць тэму, асноўную думку тэксту, даваць яму загаловак,

складаць план; адрозніваць тэксты-апавяданні, тэксты-апісанні і тэксты-разважанні; ствараць уласныя тэксты розных тыпаў маўлення, пераказваць тэксты па плане.

Валодаць:

вывучанымі нормамі беларускай літаратурнай мовы пры запісе тэксту пад дыктоўку, стварэнні ўласных тэкстаў розных тыпаў маўлення (апавяданне, апісанне, разважанне).

Сінтаксіс і пунктуацыя
(27 гадзін, з іх 5 гадзін – на кантрольную і навучальныя пісьмовыя работы)

Словазлучэнне. Галоўнае і залежнае словы ў словазлучэнні.

Сказ як сінтаксічная адзінка. Апавядальныя, пытальныя і пабуджальныя сказы. Клічныя сказы. Знакі прыпынку ў канцы сказа (паўтарэнне).

Будова сказа. Галоўныя члены сказа: дзейнік і выказнік (паўтарэнне). Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам, якія выражаны назоўнікам.

Даданыя члены сказа: дапаўненне, азначэнне, акалічнасць. Неразвітыя і развітыя сказы.

Сказы з аднароднымі членамі (без злучнікаў і са злучнікамі, з абагульняльнымі словамі пры аднародных членах і без іх), знакі прыпынку.

Сказы са звароткамі, знакі прыпынку.

Складаныя сказы з двума галоўнымі членамі ў кожнай частцы. Коска паміж часткамі ў складаным сказе.

Простая мова. Дыялог.

Кантрольны дыктант.

Навучальнае сачыненне-апавяданне на аснове ўласных назіранняў.

Навучальны падрабязны пераказ тэксту (з выкарыстаннем апорных слоў і словазлучэнняў).

Віды дзейнасці: выяўленне ў тэкстах клічных сказаў, вызначэнне іх сэнсавай ролі; падзел тэкстаў на сказы; пабудова сказаў розных тыпаў (па мэце выказвання і інтанацыі), уключэнне іх у тэкст; выяўленне ў тэкстах галоўных і даданых членаў сказа, вызначэнне іх сэнсава-граматычнай ролі; перабудова неразвітых сказаў у развітыя; чытанне тэкстаў, выяўленне сказаў з аднароднымі членамі, абгрунтаванне мэтазгоднасці ўжывання, складанне такіх сказаў, уключэнне іх у самастойнае выказванне; знаходжанне складаных сказаў у тэксце, вызначэнне іх ролі, складанне новых, уключэнне ў вусныя і пісьмовыя выказванні.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

будову словазлучэння і простага сказа; тыпы сказаў па мэце выказвання і інтанацыі; правілы пастаноўкі працяжніка паміж дзейнікам і выказнікам, якія выражаны назоўнікам; патрабаванні да падрабязнага пераказу; правілы пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі, звароткамі; будову складанага сказа; правілы пастаноўкі коскі паміж часткамі ў складаным сказе; асаблівасці сказаў з простай мовай, дыялогу, іх пунктуацыйнае афармленне.

Умець:

дзяліць тэксты на сказы, вызначаць граматычную аснову і словазлучэнні; карыстацца інтанацыяй для абазначэння меж сказаў, выяўляць іх тыпы (па мэце выказвання і інтанацыі); складаць і ўжываць розныя тыпы словазлучэнняў і сказаў (у тым ліку сказы з аднароднымі членамі і звароткамі), выконваць сінтаксічны разбор словазлучэнняў і сказаў, ставіць знакі прыпынку ў адпаведнасці з вывучанымі правіламі; чытаць тэксты, вызначаць іх адрасата, стыль, мэтанакіраванасць; выдзяляць апорныя словы і словазлучэнні; вусна і пісьмова падрабязна пераказваць мастацкія тэксты; ствараць тэксты-апавяданні на аснове ўласных назіранняў.

Валодаць:

правіламі пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі, са звароткамі, у складаных сказах з двума галоўнымі членамі ў кожнай частцы; нормамі беларускай літаратурнай мовы пры падрабязным пераказе мастацкіх тэкстаў, стварэнні тэкстаў-апавяданняў на аснове ўласных назіранняў.

## Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія
## (33 гадзіны, з іх 6 гадзін – на кантрольную і навучальныя пісьмовыя работы)

Гукі беларускай мовы. Літара як знак гука. Прызначэнне літар е, ё, ю, я, і.

Беларускі алфавіт. Назвы літар. Склад. Націск. Правілы пераносу слоў (паўтарэнне).

Галосныя гукі. Вымаўленне і правапіс галосных о, э, а; е, ё, я. Вымаўленне і правапіс спалучэнняў іё (ыё), ія (ыя), іе (ые) у запазычаных словах.

Зычныя гукі. Зычныя глухія, звонкія і санорныя; свісцячыя і шыпячыя; цвёрдыя, мяккія і зацвярдзелыя; іх вымаўленне і правапіс.

Мяккі знак і апостраф. Зычныя [д] – [дз’], [т] – [ц’], іх вымаўленне і правапіс. Правапіс у, ў.

Падоўжаныя зычныя, іх вымаўленне і правапіс.

Прыстаўныя зычныя і галосныя, іх правапіс.

Правапіс некаторых спалучэнняў зычных.

Навучальны падрабязны пераказ мастацкага тэксту.

Навучальнае сачыненне-апавяданне пра выпадак з жыцця.

Кантрольны падрабязны пераказ мастацкага тэксту.

Віды дзейнасці: гукавы запіс слоў, параўнанне і супастаўленне гукаў па сэнсаадрознівальнай ролі, спосабах утварэння; запіс слоў у алфавітным парадку; падзел слоў на склады і для пераносу; запіс слоў і пастаноўка націску з выкарыстаннем арфаграфічнага слоўніка, назіранне за сэнсаадрознівальнай роляй націску; чытанне тэкстаў у адпаведнасці з нормамі літаратурнага вымаўлення, з захаваннем інтанацыі; чытанне і запіс пад дыктоўку слоў, словазлучэнняў, сказаў і тэкстаў з захаваннем арфаграфічных норм; стварэнне паведамленняў на лінгвістычную тэму на аснове табліц і схем, тэкстаў-апавяданняў; пераказ мастацкага тэксту.

## Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

фанетычную сістэму беларускай мовы; суадносіны паміж гукамі і літарамі, беларускі алфавіт; правілы складападзелу і пераносу слоў; асноўныя арфаэпічныя і арфаграфічныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Умець:

адрозніваць гукі і літары; правільна вымаўляць гукі і перадаваць іх на пісьме; тлумачыць напісанні, карыстацца арфаграфічным слоўнікам; рабіць фанетычны разбор слоў; захоўваць інтанацыю пры чытанні, вызначаць сродкі, з дапамогай якіх дасягаецца мілагучнасць маўлення; правільна пісаць словы з вывучанымі арфаграмамі; вусна і пісьмова падрабязна пераказваць мастацкія тэксты, ствараць тэксты-апавяданні пра выпадак з жыцця.

Валодаць:

вывучанымі арфаэпічнымі, акцэнталагічнымі нормамі, нормамі беларускай літаратурнай мовы пры падрабязным пераказе мастацкіх тэкстаў, стварэнні тэкстаў-апавяданняў пра выпадак з жыцця.

## Лексіка. Фразеалогія
(19 гадзін, з іх 4 гадзіны – на кантрольную і навучальную пісьмовыя работы)

Лексічнае значэнне слова. Адназначныя і мнагазначныя словы. Прамое і пераноснае значэнне слова. Сінонімы. Антонімы. Амонімы (азнаямленне).

Агульнаўжывальныя словы і словы абмежаванага ўжытку. Устарэлыя

словы і неалагізмы.

Запазычаныя словы ў беларускай мове.

Паняцце пра фразеалагізмы, роля фразеалагізмаў у маўленні.

Навучальнае сачыненне-апісанне на аснове апорных слоў (тэксту).

Кантрольны пераказ апавядальнага тэксту.

Віды дзейнасці: вызначэнне лексічнага значэння слоў у тэксце і па слоўніку; тлумачэнне значэння слоў; падбор слоў па лексічных значэннях; складанне і запіс словазлучэнняў з выкарыстаннем слоў у прамым і пераносным значэннях; падбор да слоў сінонімаў, антонімаў; тлумачэнне лексічнага значэння слоў-амонімаў, складанне і запіс сказаў з імі; параўнанне і супастаўленне агульнаўжывальных слоў са словамі абмежаванага ўжытку, дыялектнымі і запазычанымі словамі, неалагізмамі, гістарызмамі і архаізмамі; пераклад з рускай мовы на беларускую вучэбных тэкстаў; запіс фразеалагізмаў, прыказак, прымавак; тлумачэнне іх сэнсу; праца з тлумачальным, перакладным слоўнікамі; складанне ўласных слоўнікавых артыкулаў, пераказ апавядальнага тэксту, стварэнне тэксту-апісання на аснове апорных слоў (тэксту).

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Мець уяўленне:

пра адназначныя і мнагазначныя словы, прамое і пераноснае значэнне слова, сінонімы, антонімы, амонімы, агульнаўжывальныя словы і словы абмежаванага ўжытку, устарэлыя словы і неалагізмы, запазычаныя словы, асаблівасці іх ужывання ў беларускай мове.

Умець:

вызначаць лексічнае значэнне слова па слоўніку і ў тэксце; выяўляць у тэксце агульнаўжывальныя словы і словы абмежаванага ўжытку, запазычаныя словы, устарэлыя словы і неалагізмы, дарэчы выкарыстоўваць іх у маўленні; падбіраць да слоў сінонімы і антонімы, карыстацца сінонімамі як сродкам сувязі сказаў у тэксце; выяўляць фразеалагізмы ў тэксце, тлумачыць іх значэнне, вызначаць сінтаксічную ролю, ужываць у маўленні; карыстацца тлумачальным, перакладным слоўнікамі; перакладаць з рускай мовы на беларускую вучэбныя тэксты; складаць спісы фразеалагізмаў, прыказак і прымавак; пераказваць апавядальныя тэксты; ствараць тэксты-апісанні на аснове апорных слоў (тэксту).

Валодаць:

лексічнымі, фразеалагічнымі нормамі, нормамі беларускай літаратурнай мовы пры пераказе і перакладзе тэкстаў, стварэнні ўласных выказванняў.

Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год

(3 гадзіны)

Тэкст, тыпы маўлення. Асноўныя вывучаныя арфаграфічныя і пунктуацыйныя правілы.

Віды дзейнасці: размяшчэнне сказаў (частак) у адпаведнасці з асноўнымі прыметамі тэксту; абгрунтаванне прыналежнасці тэксту да пэўнага тыпу і стылю маўлення; пабудова схем тыпаў маўлення; вымаўленне, напісанне і ўжыванне слоў з захаваннем асноўных моўных норм беларускай літаратурнай мовы; выяўленне і выпраўленне парушэнняў моўных норм; вызначэнне лексічнага значэння слоў; падбор сінонімаў і антонімаў да слоў, тлумачэнне арфаграм і пунктаграм у словах; складанне сказаў (тэкстаў) у адпаведнасці з прапанаванай маўленчай сітуацыяй.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

асноўныя прыметы тэксту, тыпаў і стыляў маўлення; вывучаныя арфаграфічныя і пунктуацыйныя правілы.

Умець:

размяшчаць сказы (часткі) з захаваннем асноўных прымет тэксту і пэўнага тыпу маўлення; складаць схемы тыпаў маўлення; абгрунтоўваць прыналежнасць тэксту да пэўнага тыпу і стылю маўлення; падбіраць сінонімы і антонімы да слоў; выяўляць і выпраўляць парушэнні норм сучаснай беларускай літаратурнай мовы; тлумачыць напісанне слоў і пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах; прымяняць на практыцы арфаграфічныя і пунктуацыйныя правілы, вывучаныя ў V класе; ствараць вусныя і пісьмовыя выказванні розных тыпаў і стыляў маўлення; выбіраць моўныя сродкі ў залежнасці ад маўленчай сітуацыі.

Валодаць:

вывучанымі нормамі беларускай літаратурнай мовы ў вуснай і пісьмовай формах у розных маўленчых сітуацыях.

## VI клас

(105 гадзін на год, 3 гадзіны на тыдзень; з іх 16 гадзін – на кантрольныя і навучальныя пісьмовыя работы, на напісанне якіх адводзяцца асобныя ўрокі; 2 гадзіны рэзервовыя)

### Беларуская мова – нацыянальная мова беларускага народа
(1 гадзіна)

Беларуская мова як адлюстраванне нацыянальнага бачання свету. Літаратурная мова і народныя гаворкі.

Віды дзейнасці: чытанне тэкстаў, адказы на пытанні, пераказ тэкстаў на тэму «Беларуская мова – нацыянальная мова беларускага народа».

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Мець уяўленне:

пра асаблівасці літаратурнай і дыялектнай форм мовы.

Умець:

адрозніваць літаратурную мову ад народных гаворак; пераказваць прачытаныя тэксты на тэму «Беларуская мова – нацыянальная мова беларускага народа», ствараць уласныя выказванні пра самабытнасць беларускай мовы.

Валодаць:

нормамі беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні ўласных выказванняў.

Тэкст
(2 гадзіны)

Тэкст і яго асноўныя прыметы: тэматычнае адзінства, разгорнутасць, паслядоўнасць, звязнасць (спосабы і сродкі сувязі), завершанасць (паглыбленне). Падтэмы тэксту. Ключавыя (апорныя) словы і сказы ў тэксце.

Паглыбленне паняцця пра апавяданне, апісанне і разважанне.

Віды дзейнасці: чытанне тэкстаў-апавяданняў, тэкстаў-апісанняў і тэкстаў-разважанняў, асэнсаванне асаблівасцей разгортвання думкі ў іх; вызначэнне тыпаў маўлення, выяўленне кампазіцыйных асаблівасцей тэкстаў розных тыпаў.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

прыметы тэксту, тыпы маўлення (апавяданне, апісанне, разважанне).

Умець:

вызначаць прыметы тэксту, тэму і асноўную думку тэксту, даваць яму загаловак; дзяліць на лагічныя часткі, вызначаць апорныя словы і сказы; вызначаць тып тэксту і складаць яго кампазіцыйную схему; выяўляць кампазіцыйныя асаблівасці тэкстаў розных тыпаў маўлення; адрозніваць тэксты-апавяданні, тэксты-апісанні і тэксты-разважанні; пераказваць прачытаныя тэксты-апавяданні, тэксты-апісанні і тэксты-разважанні, ствараць уласныя тэксты розных тыпаў маўлення.

Валодаць:

нормамі беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні ўласных выказванняў розных тыпаў маўлення.

Паўтарэнне вывучанага ў V класе
(3 гадзіны)

Словазлучэнне і сказ. Знакі прыпынку ў простых і складаных сказах.

Гукі беларускай мовы, іх вымаўленне і абазначэнне на пісьме.

Слова, яго лексічнае значэнне.

Віды дзейнасці: вызначэнне ў сказах граматычных асноў, словазлучэнняў; складанне і інтанаванне розных тыпаў сказаў, стварэнне з імі ўласных выказванняў; чытанне тэкстаў мастацкага стылю, вызначэнне іх мэтанакіраванасці, жанру і асаблівасцей будовы; запіс слоў і сказаў пад дыктоўку; вызначэнне ў тэкстах адназначных і мнагазначных слоў, слоў з прамым і пераносным значэннем, тлумачэнне іх значэння; адрозненне сінонімаў, антонімаў, правільнае іх ужыванне ў маўленні.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

будову словазлучэння і сказа; правілы пастаноўкі знакаў прыпынку ў простых і складаных сказах; фанетычную сістэму беларускай мовы, суадносіны паміж гукамі і літарамі; прыметы адназначных і мнагазначных слоў, сінонімаў, антонімаў, амонімаў.

Умець:

абгрунтоўваць пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах; тлумачыць лексічнае значэнне слоў, адрозніваць словы і іх формы; вызначаць у тэкстах адназначныя і мнагазначныя словы, словы з прамым і пераносным значэннем, тлумачыць іх значэнне; адрозніваць сінонімы, антонімы, правільна іх ужываць у маўленні; правільна перадаваць гукі пры чытанні і на пісьме; карыстацца рознымі відамі слоўнікаў; ствараць уласныя выказванні з выкарыстаннем адназначных і мнагазначных слоў, слоў з прамым і пераносным значэннем, сінонімаў, антонімаў, амонімаў.

Валодаць:

нормамі беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні ўласных выказванняў.

Стылі маўлення
(3 гадзіны)

Маўленчая сітуацыя і яе прыметы. Стылі маўлення (паўтарэнне).

Афіцыйны стыль маўлення, яго жанры, сфера выкарыстання.

Публіцыстычны стыль, яго жанры, сфера выкарыстання.

Віды дзейнасці: чытанне і аналіз тэкстаў афіцыйнага і публіцыстычнага стыляў; напісанне афіцыйных папер (адрас на канверце, аб'ява аб занятках гуртка, правядзенні сходу); падрыхтоўка вусных і пісьмовых віншаванняў; напісанне лістоў.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

прыметы маўленчай сітуацыі, характэрныя прыметы афіцыйнага і публіцыстычнага стыляў.

Умець:

выяўляць у тэкстах прыметы афіцыйнага і публіцыстычнага стыляў; абгрунтоўваць прыналежнасць тэксту да пэўнага стылю маўлення; пісаць афіцыйныя паперы (адрас на канверце, аб'ява аб занятках гуртка, правядзенні сходу), лісты; рыхтаваць вусныя і пісьмовыя віншаванні.

Валодаць:

нормамі беларускай літаратурнай мовы пры напісанні афіцыйных папер, лістоў, падрыхтоўцы вусных і пісьмовых віншаванняў.

## ГРАМАТЫКА

### Склад слова. Словаўтварэнне і арфаграфія
### (18 гадзін, з іх 2 гадзіны – на кантрольную пісьмовую работу)

Марфемная будова слова. Аснова і канчатак. Нулявы канчатак. Корань слова (паўтарэнне). Аднакаранёвыя словы і формы аднаго і таго слова. Прыстаўка і суфікс як значымыя часткі слова.

Чаргаванне зычных і галосных у аснове.

Правапіс прыставак, якія заканчваюцца на зычны (паўтарэнне). Правапіс і, й, ы пасля прыставак.

Утварэнне слоў. Утваральная аснова (азнаямленне). Спосабы ўтварэння слоў: прыставачны, суфіксальны, прыставачна-суфіксальны; складанне слоў і асноў.

Утварэнне і правапіс складаных слоў. Складанаскарочаныя словы (азнаямленне).

Кантрольны падрабязны пераказ апавядальнага тэксту.

Віды дзейнасці: чытанне тэкстаў, выяўленне ў іх аднакаранёвых слоў і форм аднаго і таго слова, вызначэнне сэнсавай ролі марфем; групоўка слоў па значэнні кораня, суфікса, прыстаўкі; запіс слоў з графічным абазначэннем марфем; тлумачэнне спосабу ўтварэння слоў, падбор аднакаранёвых слоў, складанне з імі сказаў і тэкстаў; разбор слоў па

саставе; праца з марфемным і словаўтваральным слоўнікамі; пераклад тэкстаў з рускай мовы на беларускую з захаваннем зместу і моўных асаблівасцей; вусны і пісьмовы падрабязны пераказ апавядальнага тэксту.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

значымыя часткі слова – марфемы; спосабы ўтварэння слоў.

Умець:

выдзяляць у словах значымыя часткі – марфемы, аснову; адрозніваць аднакаранёвыя словы і формы аднаго і таго слова; групаваць словы па значэнні кораня, суфікса і прыстаўкі; разбіраць словы па саставе, графічна абазначаць марфемы; рабіць словаўтваральны разбор; тлумачыць спосаб утварэння і вызначаць сродкі ўтварэння слоў; адрозніваць спосабы ўтварэння слоў; выкарыстоўваць аднакаранёвыя словы як сродак сувязі сказаў у тэксце; карыстацца марфемным і словаўтваральным слоўнікамі; перакладаць тэксты з рускай мовы на беларускую з захаваннем зместу і моўных асаблівасцей; вусна і пісьмова падрабязна пераказваць апавядальныя тэксты.

Валодаць:

нормамі беларускай літаратурнай мовы пры перакладзе тэкстаў з рускай мовы на беларускую, пераказе апавядальнага тэксту.

## МАРФАЛОГІЯ І АРФАГРАФІЯ

### Самастойныя і службовыя часціны мовы
(1 гадзіна)

Самастойныя і службовыя часціны мовы.

Віды дзейнасці: чытанне тэкстаў, выяўленне ў іх самастойных і службовых часцін мовы; вызначэнне граматычных прымет вывучаных часцін мовы.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

асновы падзелу слоў на самастойныя і службовыя часціны мовы.

Умець:

выяўляць у сказах, тэксце самастойныя і службовыя часціны мовы, абгрунтоўваць прыналежнасць вывучаных часцін мовы да самастойных; ствараць уласныя выказванні з выкарыстаннем слоў розных часцін мовы.

Валодаць:

нормамі беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні ўласных выказванняў.

## Назоўнік
(27 гадзін, з іх 5 гадзін – на навучальныя і кантрольную пісьмовыя работы)

Назоўнік як часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Пачатковая форма. Агульныя і ўласныя назоўнікі. Правапіс уласных назваў (практычна). Назоўнікі адушаўлёныя і неадушаўлёныя. Назоўнікі канкрэтныя, абстрактныя, зборныя, рэчыўныя.

Род назоўнікаў. Несупадзенне роду некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах.

Лік назоўнікаў. Назоўнікі, якія маюць форму толькі адзіночнага ці толькі множнага ліку. Несупадзенне ліку некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах.

Склон назоўнікаў. Асновы назоўнікаў. Асаблівасці правапісу канчаткаў назоўнікаў 1-га скланення (у давальным і месным склонах адзіночнага ліку). Асаблівасці правапісу канчаткаў назоўнікаў 2-га скланення (у родным і месным склонах адзіночнага ліку). Асаблівасці правапісу канчаткаў назоўнікаў 3-га скланення (у творным склоне адзіночнага ліку). Правапіс канчаткаў назоўнікаў у множным ліку (у родным і творным склонах).

Скланенне назоўнікаў, якія абазначаюць імёны, прозвішчы і назвы населеных пунктаў на -оў, -ёў, -еў, -аў, -ын, -ін.

Рознаскланяльныя назоўнікі. Нескланяльныя назоўнікі.

Спосабы ўтварэння назоўнікаў. Правапіс назоўнікаў з суфіксамі -ак-, -ык, -ік, -ачк-, -ечк-; мяккі знак перад суфіксамі -к-, -чык- і ў суфіксах -аньк-, -еньк-. Складаныя назоўнікі, іх правапіс.

Правапіс не (ня), ні з назоўнікамі.

Кантрольны дыктант.

Навучальны сціслы пераказ апавядальных тэкстаў.

Навучальнае сачыненне-апавяданне ў мастацкім стылі па апорных словах.

Віды дзейнасці: вусныя і пісьмовыя практыкаванні на ўжыванне назоўнікаў, лік і род якіх у беларускай і рускай мовах не супадаюць, дапасаванне да іх прыметнікаў; складанне і запіс сказаў з назоўнікамі, якія абазначаюць людзей па прафесіі, нацыянальнай прыналежнасці і іншых прыметах; выяўленне ў тэкстах назоўнікаў 1, 2, 3-га скланення, тлумачэнне правапісу канчаткаў; складанне спісаў вучняў і назваў населеных пунктаў сваёй мясцовасці; чытанне тэкстаў мастацкага стылю, выяўленне ў іх слоў з вывучанымі суфіксамі, тлумачэнне іх значэння; марфалагічны разбор

назоўнікаў; стварэнне паведамленняў на лінгвістычную тэму пра назоўнік як часціну мовы на аснове табліц і схем; стварэнне тэкстаў-апавяданняў у мастацкім стылі па апорных словах; сціслы пераказ тэксту.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю назоўнікаў, асаблівасці правапісу назоўнікаў 1, 2 і 3-га скланенняў, рознаскланяльных і нескланяльных назоўнікаў, правапіс суфіксаў і канчаткаў назоўнікаў; спосабы ўтварэння назоўнікаў.

Умець:

распазнаваць назоўнікі ў пачатковай форме і ва ўскосных склонах на аснове іх сэнсавых, марфалагічных і сінтаксічных прымет; абгрунтоўваць правапіс суфіксаў і канчаткаў назоўнікаў; скланяць назоўнікі; вызначаць сэнсава-граматычную і стылістычную ролю назоўнікаў у тэкстах; рабіць марфалагічны разбор назоўнікаў; правільна ўтвараць і ўжываць у вусным і пісьмовым маўленні назоўнікі розных лексіка-семантычных груп; правільна выкарыстоўваць назоўнікі ў спалучэнні з дзеясловамі і прыметнікамі; выкарыстоўваць нескланяльныя назоўнікі, назоўнікі-сінонімы і назоўнікі-антонімы ў вусных і пісьмовых выказваннях; карыстацца назоўнікамі ў якасці тэкстаўтваральнага сродку, а таксама з улікам стылявой прыналежнасці тэксту; складаць сказы з назоўнікамі пэўных семантычных груп; ствараць тэксты-апавяданні ў мастацкім стылі па апорных словах; сцісла пераказваць тэксты.

Валодаць:

нормамі правапісу назоўнікаў розных разрадаў, нормамі беларускай літаратурнай мовы пры сціслым пераказе тэксту, стварэнні ўласных тэкстаў-апавяданняў мастацкага стылю.

Прыметнік
(19 гадзін, з іх 4 гадзіны – на навучальныя пісьмовыя работы)

Прыметнік як часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Пачатковая форма.

Якасныя, адносныя і прыналежныя прыметнікі. Ступені параўнання якасных прыметнікаў, іх утварэнне і ўжыванне.

Скланенне якасных, адносных і прыналежных прыметнікаў.

Асноўныя спосабы ўтварэння прыметнікаў. Прыметнікі з суфіксамі ацэнкі, сфера іх ужывання, правапіс. Прыметнікі з суфіксам -ск-, іх правапіс. Правапіс -н-, -нн- у прыметніках.

Утварэнне і правапіс складаных прыметнікаў. Правапіс не (ня) з

прыметнікамі.

Складаны план. Навучальны падрабязны пісьмовы пераказ мастацкага тэксту з элементамі апісання рэчаў, жывёл або памяшкання па складаным плане.

Навучальнае сачыненне-апавяданне з апісаннем прымет рэчаў, жывёл або памяшкання.

Віды дзейнасці: чытанне мастацкіх, навуковых і афіцыйных тэкстаў, вызначэнне ў іх ролі прыметнікаў; пашырэнне тэксту прыметнікамі, вызначэнне іх сэнсава-стылістычнай ролі; запіс прыметнікаў у патрэбнай форме, дапасаванне іх да назоўнікаў у родзе, ліку і склоне; практыкаванні на ўтварэнне форм ступеней параўнання, прыметнікаў з суфіксамі ацэнкі, -ск-; пашырэнне тэксту прыметнікамі, вызначэнне іх сэнсава-стылістычнай ролі; марфалагічны разбор прыметнікаў; стварэнне паведамленняў на лінгвістычную тэму аб прыметніку як часціне мовы на аснове табліц і схем; пераказ мастацкіх тэкстаў з апісаннем прымет рэчаў, жывёл або памяшкання па складаным плане; стварэнне ўласных тэкстаў-апавяданняў з апісаннем прымет рэчаў, жывёл або памяшкання.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю прыметнікаў, асаблівасці скланення якасных, адносных і прыналежных прыметнікаў, асноўныя спосабы іх утварэння, асаблівасці ўжывання поўнай і кароткай форм прыметнікаў, правапіс прыметнікаў.

Умець:

распазнаваць прыметнікі ў пачатковай форме і ва ўскосных склонах на аснове іх сэнсавых, марфалагічных і сінтаксічных прымет; правільна ўтвараць формы ступеней параўнання, прыметнікі з суфіксамі ацэнкі, -ск-; адрозніваць якасныя, адносныя і прыналежныя прыметнікі; скланяць прыметнікі; вызначаць сэнсава-граматычную і стылістычную ролю прыметнікаў у тэкстах; рабіць марфалагічны разбор прыметнікаў; правільна ўжываць формы ступеней параўнання прыметнікаў (смялейшы за ...; прыгажэйшы, чым ...; найсмялейшы з ...; самы смелы сярод ...); правільна ўжываць прыметнікі ў спалучэннях з назоўнікамі, якія абазначаюць асоб мужчынскага і жаночага полу (механік, заатэхнік, дырэктар), у спалучэнні з назоўнікамі агульнага роду (плакса, сірата); правільна ўжываць адносныя і прыналежныя прыметнікі ў пераносным значэнні; карыстацца назоўнікамі ў якасці тэкстаўтваральнага сродку, а таксама з улікам стылявой прыналежнасці тэксту; вусна і пісьмова пераказваць мастацкія тэксты з апісаннем прымет рэчаў, жывёл або памяшкання па складаным плане; ствараць тэксты-апавяданні з апісаннем

прымет рэчаў, жывёл або памяшкання.

Валодаць:

нормамі правапісу прыметнікаў розных разрадаў, нормамі беларускай літаратурнай мовы пры пераказе тэкстаў, стварэнні ўласных апавяданняў з элементамі апісання.

Лічэбнік

(13 гадзін, з іх 2 гадзіны – на кантрольную пісьмовую работу)

Лічэбнік як часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Лічэбнікі колькасныя і парадкавыя.

Простыя, складаныя і састаўныя колькасныя лічэбнікі, іх скланенне, ужыванне і правапіс.

Скланенне, ужыванне і правапіс парадкавых лічэбнікаў.

Скланенне, ужыванне і правапіс дробавых і зборных лічэбнікаў.

Кантрольны падрабязны пераказ апавядальнага тэксту.

Віды дзейнасці: падзел тэксту на сэнсавыя часткі, складанне плана; вызначэнне ў тэксце лічэбнікаў, розных па значэнні і саставе; запіс лічэбнікаў у патрэбнай склонавай форме; складанне сказаў з лічэбнікамі пры абазначэнні даты, свята, прыблізнай колькасці; параўнанне вымаўлення некаторых лічэбнікаў у беларускай і рускай мовах; марфалагічны разбор лічэбнікаў; пераклад з рускай мовы на беларускую тэкстаў навуковага стылю; вусны і пісьмовы пераказ апавядальнага тэксту.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю лічэбнікаў, падзел лічэбнікаў паводле значэння, граматычных прымет і складу, правапіс лічэбнікаў.

Умець:

распазнаваць лічэбнікі ў пачатковай форме і ва ўскосных склонах на аснове іх сэнсавых, марфалагічных і сінтаксічных прымет; адрозніваць парадкавыя, колькасныя (дробавыя, зборныя) лічэбнікі, простыя, складаныя і састаўныя лічэбнікі; скланяць лічэбнікі; вызначаць сэнсава-граматычную і стылістычную ролю лічэбнікаў у тэкстах; рабіць марфалагічны разбор лічэбнікаў; правільна ўтвараць склонавыя формы колькасных (зборных і дробавых) лічэбнікаў; правільна вымаўляць і пісаць лічэбнікі ад адзінаццаці да дзевятнаццаці, а таксама пяцьдзясят, шэсцьдзясят, семдзесят, восемдзесят; спалучаць з назоўнікамі лічэбнікі два, дзве, двое, абодва, абедзве; тры, трое; чатыры, чацвёра; паўтара, паўтары; правільна карыстацца лічэбнікамі пры абазначэнні даты, свята, прыблізнай

колькасці; карыстацца лічэбнікамі ў якасці тэкстаўтваральнага сродку, а таксама з улікам стылявой прыналежнасці тэксту; перакладаць з рускай мовы на беларускую тэксты навуковага стылю; вусна і пісьмова пераказваць апавядальныя тэксты.

Валодаць:

нормамі правапісу лічэбнікаў розных разрадаў, нормамі беларускай літаратурнай мовы пры перакладзе з рускай мовы на беларускую тэкстаў навуковага стылю; вусным і пісьмовым пераказе апавядальных тэкстаў.

## Займеннік
## (14 гадзін, з іх 3 гадзіны – на навучальную і кантрольную пісьмовыя работы)

Займеннік як часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Пачатковая форма. Разрады займеннікаў па значэнні (азнаямленне).

Змяненне займеннікаў, іх утварэнне і правапіс.

Кантрольны дыктант.

Навучальнае сачыненне-апісанне родных мясцін.

Віды дзейнасці: чытанне тэкстаў, выяўленне ў іх займеннікаў і словазлучэнняў з займеннікамі, абгрунтаванне мэтазгоднасці ўжывання; запіс займеннікаў у патрэбнай склонавай форме; марфалагічны разбор займеннікаў; складанне сказаў (тэкстаў) з выкарыстаннем асабовых займеннікаў у адпаведнасці з этычнымі нормамі; складанне тэкстаў з апісаннем родных мясцін.

### Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю займеннікаў, правапіс займеннікаў.

Умець:

распазнаваць займеннікі ў пачатковай форме і ва ўскосных склонах на аснове іх сэнсавых, марфалагічных і сінтаксічных прымет; правільна вымаўляць і пісаць займеннікі розных разрадаў; вызначаць сэнсава-граматычную і стылістычную ролю займеннікаў у тэкстах; рабіць марфалагічны разбор займеннікаў; правільна ўтвараць і ўжываць займеннікі розных разрадаў ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні; выкарыстоўваць асабовыя займеннікі ў адпаведнасці з этычнымі нормамі; карыстацца займеннікамі ў якасці тэкстаўтваральнага сродку, а таксама з улікам стылявой прыналежнасці тэксту; выкарыстоўваць займеннікі як сродак сувязі сказаў і частак тэксту; ствараць тэксты з апісаннем родных

мясцін.

Валодаць:

нормамі правапісу займеннікаў розных разрадаў, нормамі беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні тэкстаў з апісаннем родных мясцін.

Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год
(2 гадзіны)

Асноўныя марфалагічныя прыметы вывучаных часцін мовы.

Віды дзейнасці: размеркаванне слоў у адпаведнасці з іх часцінамоўнай прыналежнасцю; вызначэнне пачатковай формы слоў вывучаных часцін мовы; утварэнне пэўных форм слоў; пераклад слоў (словазлучэнняў, сказаў, тэкстаў) з рускай мовы на беларускую; падбор прыметнікаў да назоўнікаў; марфалагічны разбор вывучаных часцін мовы.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю, правапіс вывучаных часцін мовы.

Умець:

распазнаваць вывучаныя часціны мовы ў пачатковай і іншых формах на аснове іх сэнсавых, марфалагічных і сінтаксічных прымет; правільна вымаўляць і пісаць вывучаныя часціны мовы ў адпаведнасці з правіламі ўтварэння і правапісу; вызначаць сэнсава-граматычную і стылістычную ролю вывучаных часцін мовы ў тэкстах, рабіць іх марфалагічны разбор; правільна ўтвараць і ўжываць вывучаныя часціны мовы ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні; ствараць вусныя і пісьмовыя выказванні розных тыпаў і стыляў маўлення; перакладаць словы (словазлучэнні, сказы, тэксты) з рускай мовы на беларускую.

Валодаць:

нормамі ўтварэння і правапісу вывучаных часцін мовы; вывучанымі нормамі беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні ўласных выказванняў у вуснай і пісьмовай формах.

VII клас
(70 гадзін на год, 2 гадзіны на тыдзень, з іх 17 гадзін – на кантрольныя і навучальныя пісьмовыя работы, на напісанне якіх адводзяцца асобныя ўрокі; 1 гадзіна рэзервовая)

Валоданне літаратурнай мовай – асноўны паказчык культуры чалавека
(1 гадзіна)

Нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Маўленчы этыкет.

Віды дзейнасці: чытанне тэкстаў з захаваннем арфаэпічных і акцэнталагічных норм беларускай літаратурнай мовы; пісьмовае афармленне тэкстаў з захаваннем асноўных норм беларускай літаратурнай мовы; падбор слоў і выразаў да сітуацый у адпаведнасці з правіламі маўленчага этыкету; удзел у дыялогах з выкарыстаннем слоў і выразаў маўленчага этыкету.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

асноўныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы, правілы маўленчага этыкету.

Умець:

адрозніваць нормы беларускай літаратурнай мовы.

Валодаць:

нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні; захоўваць правілы маўленчага этыкету.

Тэкст
(2 гадзіны)

Тэкст і яго асноўныя прыметы. Спосабы і сродкі сувязі сказаў і частак тэксту.

Паглыбленне паняцця пра разважанне як тып маўлення.

Віды дзейнасці: чытанне тэкстаў, вызначэнне асноўных прымет тэксту (тэматычнае адзінства, разгорнутасць, паслядоўнасць, звязнасць, завершанасць); выяўленне спосабу і сродкаў сувязі сказаў і частак тэксту; удзел у дыспуце на маральна-этычную тэму.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

прыметы тэксту, спосаб і сродкі сувязі сказаў у тэксце.

Умець:

вызначаць прыметы тэксту, спосаб і сродкі сувязі сказаў і частак тэксту; ствараць вусныя і пісьмовыя выказванні рознай жанрава-стылістычнай прыналежнасці з выкарыстаннем слоў розных часцін мовы ў якасці сродкаў сувязі сказаў у тэксце; прымаць удзел у дыспуце на маральна-этычную тэму.

Валодаць:

нормамі беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні вусных і пісьмовых выказванняў, удзеле ў дыспуце на маральна-этычную тэму.

Паўтарэнне вывучанага ў V–VI класах
(2 гадзіны)

Назоўнік, прыметнік, займеннік, лічэбнік як часціны мовы, іх граматычныя прыметы.

Будова слова. Словаўтварэнне вывучаных часцін мовы.

Віды дзейнасці: аналіз тэкстаў розных стыляў і жанраў, абгрунтаванне мэтазгоднасці ўжывання ў іх моўных сродкаў з улікам маўленчай сітуацыі; вызначэнне граматычных прымет вывучаных часцін мовы; стварэнне паведамленняў на лінгвістычную тэму пра вывучаныя часціны мовы на аснове табліц і схем; стварэнне ўласных выказванняў з мэтазгодным выкарыстаннем слоў розных часцін мовы.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

граматычныя прыметы, асноўныя спосабы словаўтварэння вывучаных часцін мовы.

Умець:

распазнаваць у тэксце назоўнікі, прыметнікі, лічэбнікі, займеннікі, даваць ім граматычную характарыстыку; абгрунтоўваць мэтазгоднасць ужывання моўных сродкаў з улікам маўленчай сітуацыі; вызначаць граматычныя прыметы вывучаных часцін мовы.

Валодаць:

марфалагічнымі моўнымі сродкамі для стварэння ўласных выказванняў.

Стылі маўлення
(1 гадзіна)

Паглыбленне паняцця пра стылі маўлення. Стылеўтваральная роля вывучаных часцін мовы.

Віды дзейнасці: чытанне і аналіз тэкстаў розных стыляў, абгрунтаванне выбару моўных сродкаў у іх; стварэнне вусных і пісьмовых выказванняў, выяўленне сэнсава-стылістычнай ролі слоў розных часцін мовы.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

характэрныя прыметы стыляў маўлення; мець уяўленне пра стылеўтваральную ролю вывучаных часцін мовы.

Умець:

вызначаць ролю вывучаных часцін мовы ў стварэнні тэкстаў розных стыляў маўлення; абгрунтоўваць выбар моўных сродкаў у тэкстах рознай стылявой прыналежнасці; ствараць вусныя і пісьмовыя выказванні з улікам стылеўтваральнай ролі слоў розных часцін мовы.

Валодаць:

нормамі беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні вусных і пісьмовых выказванняў.

Дзеяслоў
(14 гадзін, з іх 3 гадзіны – на кантрольную і навучальную пісьмовыя работы)

Дзеяслоў як часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Правапіс не (ня) з дзеясловамі.

Неазначальная форма дзеяслова, яе сінтаксічная роля.

Асабовыя і безасабовыя, пераходныя і непераходныя, зваротныя і незваротныя дзеясловы (азнаямленне).

Трыванні дзеяслова. Правапіс дзеясловаў з суфіксамі -ава- (-ява-), -ыва- (-іва-), -ва-.

Лады дзеяслова (абвесны, умоўны, загадны).

Абвесны лад. Часы дзеяслова, утварэнне і ўжыванне часавых форм дзеяслова.

Змяненне дзеясловаў I і II спражэнняў. Рознаспрагальныя дзеясловы.

Спосабы ўтварэння дзеясловаў.

Кантрольны дыктант.

Навучальны пераказ тэксту з заменай часу дзеясловаў.

Віды дзейнасці: выяўленне ў тэкстах асабовых, безасабовых і зваротных дзеясловаў, дзеяслоўных словазлучэнняў, вызначэнне сэнсава-граматычнай і стылістычнай ролі дзеясловаў у тэкстах; аналіз ужывання дзеясловаў у тэкстах-апісаннях і тэкстах-апавяданнях; апісанне моўных з’яў, знаходжанне апісанняў у тэкстах навуковага стылю; чытанне і аналіз тэкстаў з дзеясловамі прошлага часу пры назоўніках, якія абазначаюць прафесіі, пасады, званні; пераказ тэксту з заменай часу дзеясловаў; марфалагічны разбор дзеясловаў.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю

дзеясловаў.

Умець:

распазнаваць дзеясловы ў тэксце на аснове іх сэнсавых, марфалагічных і сінтаксічных прымет; суадносіць дзеясловы з аднакаранёвымі словамі іншых часцін мовы; вызначаць сэнсава-граматычную і стылістычную ролю дзеясловаў у тэкстах; рабіць марфалагічны разбор дзеясловаў; правільна пісаць дзеясловы ўмоўнага ладу, суфіксы -ава- (-ява-), -ыва- (-іва-), -ва- у дзеясловах, асабовыя канчаткі дзеясловаў, не (ня) з дзеясловамі; правільна ўтвараць і ўжываць у вусным і пісьмовым маўленні формы ладу і часу дзеясловаў; ужываць дзеясловы ў прамым і пераносным значэнні; карыстацца дзеясловамі-сінонімамі і дзеясловамі-антонімамі; правільна ўжываць у сказах дзеясловы прошлага часу пры назоўніках, якія абазначаюць прафесіі, пасады, званні; карыстацца дзеясловамі ў якасці тэкстаўтваральнага сродку, а таксама з улікам тыпу тэксту (дзеясловы са значэннем стану, наяўнасці – у тэкстах-апісаннях, дынамічныя дзеясловы – у тэкстах-апавяданнях); пераказваць тэксты з заменай часу дзеясловаў.

Валодаць:

нормамі ўтварэння і правапісу дзеясловаў I і II спражэнняў, нормамі беларускай літаратурнай мовы пры пераказе тэксту з заменай часу дзеясловаў.

## Дзеепрыметнік
## (13 гадзін, з іх 4 гадзіны – на кантрольную і навучальную пісьмовыя работы)

Дзеепрыметнік як асобая форма дзеяслова: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля.

Скланенне поўных дзеепрыметнікаў, правапіс іх склонавых канчаткаў.

Дзеепрыметнікавы зварот, знакі прыпынку.

Дзеепрыметнікі незалежнага і залежнага стану, іх утварэнне і ўжыванне. Правапіс суфіксаў дзеепрыметнікаў залежнага стану прошлага часу -н-, -ен-, -ан-, -т-. Поўная і кароткая формы дзеепрыметніка. Асаблівасці ўжывання дзеепрыметнікаў у беларускай мове.

Правапіс не (ня) з дзеепрыметнікамі.

Навучальнае сачыненне-апісанне (мастацкае апісанне знешнасці чалавека).

Кантрольны падрабязны пераказ тэксту.

Віды дзейнасці: чытанне тэкстаў, вызначэнне адрасата і мэты выказвання, знаходжанне дзеепрыметнікаў і дзеепрыметнікавых зваротаў, вызначэнне іх сэнсава-граматычнай і стылістычнай ролі; замена дзеепрыметнікаў і дзеепрыметнікавых зваротаў іншымі моўнымі сродкамі, выяўленне сэнсавых адрозненняў; марфалагічны разбор дзеепрыметнікаў,

стварэнне паведамленняў на лінгвістычную тэму аб дзеепрыметніку як асобай форме дзеяслова на аснове табліц і схем; пераклад з рускай мовы на беларускую тэкстаў з элементамі апісання знешнасці чалавека; складанне мастацкіх тэкстаў з апісаннем знешнасці чалавека.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю дзеепрыметнікаў; асаблівасці ўжывання дзеепрыметнікаў у беларускай мове; правілы ўтварэння, напісання дзеепрыметнікаў, выдзялення дзеепрыметнікаў і дзеепрыметнікавых зваротаў знакамі прыпынку.

Умець:

распазнаваць у тэксце дзеепрыметнікі і дзеепрыметнікавыя звароты на аснове іх сэнсавых, марфалагічных і сінтаксічных прымет, вызначаць іх ролю ў тэкстах; замяняць дзеепрыметнікі і дзеепрыметнікавыя звароты іншымі моўнымі сродкамі, выяўляць сэнсавыя адрозненні; утвараць розныя формы дзеепрыметнікаў; выконваць марфалагічны разбор дзеепрыметнікаў; правільна скланяць дзеепрыметнікі і пісаць іх склонавыя канчаткі, суфіксы дзеепрыметнікаў залежнага стану прошлага часу -н-, -ен-, -ан-, -т-, не (ня) з дзеепрыметнікамі; выдзяляць знакамі прыпынку дзеепрыметнікі і дзеепрыметнікавыя звароты ў становішчы пасля слова, якое дзеепрыметнік паясняе, перад асабовым займеннікам; правільна ўжываць дзеепрыметнікі цяперашняга і прошлага часу, поўную і кароткую формы дзеепрыметнікаў ва ўласным маўленні; складаць сказы з дзеепрыметнікавымі зваротамі, інтанаваць сказы з дзеепрыметнікавымі зваротамі; карыстацца сказамі з дзеепрыметнікавымі зваротамі і складанымі сказамі як сінонімамі; камунікатыўна мэтазгодна выкарыстоўваць дзеепрыметнікі ў тэкстах навуковага і афіцыйнага стыляў; падрабязна пераказваць тэксты; перакладаць з рускай мовы на беларускую тэксты з элементамі апісання знешнасці чалавека; ствараць мастацкае апісанне знешнасці чалавека.

Валодаць:

нормамі ўтварэння і правапісу дзеепрыметнікаў залежнага і незалежнага стану, нормамі беларускай літаратурнай мовы пры падрабязным пераказе тэксту, перакладзе тэкстаў з рускай мовы на беларускую, стварэнні мастацкага апісання знешнасці чалавека.

Дзеепрыслоўе
(6 гадзін, з іх 2 гадзіны – на навучальную пісьмовую работу)

Дзеепрыслоўе як асобая форма дзеяслова: агульнае значэнне,

марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Правапіс не (ня) з дзеепрыслоўямі.

Дзеепрыслоўны зварот, знакі прыпынку.

Дзеепрыслоўі незакончанага і закончанага трывання, іх утварэнне і правапіс.

Патрабаванні да выбарачнага пераказу.

Навучальны выбарачны пераказ тэкстаў з дзеепрыслоўямі і дзеепрыслоўнымі зваротамі.

Віды дзейнасці: выбарачнае чытанне тэкстаў з мэтай адказу на пастаўленыя пытанні, выяўленне дзеепрыслоўяў і дзеепрыслоўных зваротаў, абгрунтаванне мэтазгоднасці ўжывання; замена дзеепрыслоўных зваротаў іншымі сінтаксічнымі канструкцыямі, выяўленне сэнсавых адрозненняў; запіс сказаў (тэкстаў) з заменай дзеясловаў адпаведнымі дзеепрыслоўямі; пашырэнне сказаў (тэкстаў) дзеепрыслоўнымі зваротамі; марфалагічны разбор дзеепрыслоўяў; стварэнне паведамленняў на лінгвістычную тэму аб дзеепрыслоўі як асобай форме дзеяслова на аснове табліц і схем; выбарачны пераказ тэкстаў з дзеепрыслоўямі і дзеепрыслоўнымі зваротамі.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю дзеепрыслоўяў; правілы ўтварэння, напісання дзеепрыслоўяў, выдзялення дзеепрыслоўяў і дзеепрыслоўных зваротаў знакамі прыпынку.

Умець:

распазнаваць у тэксце дзеепрыслоўі і дзеепрыслоўныя звароты на аснове іх сэнсавых, марфалагічных і сінтаксічных прымет, вызначаць іх ролю ў тэкстах; утвараць розныя формы дзеепрыслоўяў (закончанага і незакончанага трывання); выконваць марфалагічны разбор дзеепрыслоўяў; правільна пісаць суфіксы дзеепрыслоўяў закончанага (-шы, -ўшы) і незакончанага (-ачы (-ячы), -учы (-ючы)) трывання, не (ня) з дзеепрыслоўямі; правільна ўжываць дзеепрыслоўі закончанага і незакончанага трывання ва ўласным маўленні; інтанаваць сказы з дзеепрыслоўямі і дзеепрыслоўнымі зваротамі; карыстацца сказамі з дзеепрыслоўнымі зваротамі і сказамі з аднароднымі выказнікамі як сінонімамі; камунікатыўна мэтазгодна выкарыстоўваць дзеепрыслоўі для абазначэння дадатковага дзеяння; рабіць выбарачны пераказ тэкстаў з дзеепрыслоўямі і дзеепрыслоўнымі зваротамі.

Валодаць:

нормамі ўтварэння і правапісу дзеепрыслоўяў незакончанага і закончанага трывання, нормамі беларускай літаратурнай мовы пры

выбарачным пераказе тэкстаў з дзеепрыслоўямі і дзеепрыслоўнымі зваротамі.

Прыслоўе
(12 гадзін, з іх 4 гадзіны – на кантрольную і навучальную пісьмовыя работы)

Прыслоўе як часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Разрады прыслоўяў па значэнні (азнаямленне).

Ступені параўнання прыслоўяў, асаблівасці іх ужывання ў беларускай мове.

Утварэнне прыслоўяў. Правапіс прыслоўяў разам, праз здучок. Правапіс спалучэнняў, блізкіх да прыслоўяў.

Правапіс не (ня), ні з прыслоўямі.

Кантрольны падрабязны пераказ тэксту мастацкага стылю.

Навучальнае сачыненне-апісанне вёскі (горада, мікраераёна).

Віды дзейнасці: чытанне тэкстаў, вызначэнне адрасата і мэты выказвання, знаходжанне прыслоўяў, вызначэнне іх сэнсава-граматычнай і стылістычнай ролі; выбарачна-размеркавальны дыктант з запісам прыслоўяў у адпаведнасці з напісаннем разам, праз злучок ці асобна; выпісванне словазлучэнняў з прыслоўямі, абгрунтаванне спосабу іх утварэння; падбор беларускіх адпаведнікаў да спалучэнняў з прыслоўямі рускай мовы; марфалагічны разбор прыслоўяў; стварэнне паведамленняў на лінгвістычную тэму аб прыслоўі як часціне мовы на аснове табліц і схем; падрабязны пераказ тэксту мастацкага стылю; стварэнне тэкстаў з элементамі апісання пэўнай мясцовасці.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю прыслоўяў, асноўныя спосабы ўтварэння прыслоўяў, іх правапіс.

Умець:

распазнаваць у тэксце прыслоўі на аснове іх сэнсавых, марфалагічных і сінтаксічных прымет, вызначаць іх сэнсава-граматычную і стылістычную ролю, спосаб утварэння; правільна ўтвараць формы ступеней параўнання прыслоўяў; выконваць марфалагічны разбор прыслоўяў; правільна пісаць прыслоўі разам і праз злучок; пісаць асобна спалучэнні, блізкія да прыслоўяў, не (ня), ні з прыслоўямі; ужываць прыслоўі як сродак сувязі сказаў у тэксце, сродак арганізацыі тэкстаў розных тыпаў (для перадачы месцазнаходжання прадметаў – у тэкстах-апісаннях, прыслоўяў па-першае, па-другое і іншых – у тэкстах-развагах); карыстацца формамі ступеней

параўнання прыслоўяў як сінонімамі; рабіць падрабязны пераказ тэксту мастацкага стылю; ствараць тэксты з элементамі апісання пэўнай мясцовасці.

Валодаць:

нормамі ўтварэння і правапісу прыслоўяў, нормамі беларускай літаратурнай мовы пры падрабязным пераказе тэксту мастацкага стылю, стварэнні тэкстаў з элементамі апісання пэўнай мясцовасці.

Службовыя часціны мовы і выклічнік
(1 гадзіна)

Паняцце пра службовыя часціны мовы. Месца выклічніка ў сістэме часцін мовы.

Віды дзейнасці: чытанне тэкстаў, выяўленне ў іх адрозненняў паміж самастойнымі і службовымі часцінамі мовы, абгрунтаванне іх спецыфікі; разбор сказаў па часцінах мовы, графічны сінтаксічны разбор сказаў.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Мець уяўленне:

пра агульную характарыстыку і спецыфіку службовых часцін мовы і выклічніка, іх ролю ў будове словазлучэнняў і сказаў, адрозненне ад слоў самастойных часцін мовы.

Умець:

адрозніваць службовыя часціны мовы і выклічнік ад самастойных часцін мовы; вызначаць, з якімі самастойнымі часцінамі мовы яны ўжыты.

Валодаць:

нормамі беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні ўласных выказванняў з выкарыстаннем слоў розных часцін мовы.

Прыназоўнік
(2 гадзіны)

Прыназоўнік як службовая часціна мовы. Асноўныя значэнні прыназоўнікаў (азнаямленне).

Вытворныя і невытворныя прыназоўнікі.

Прыназоўнікі простыя, складаныя і састаўныя, іх ужыванне і правапіс.

Віды дзейнасці: чытанне тэкстаў, вызначэнне адрасата і мэты выказвання, выяўленне прыназоўнікаў, вызначэнне іх сэнсава-граматычнай і стылістычнай ролі; устанаўленне адпаведнасці паміж значэннямі прыназоўнікаў і прыназоўнікавымі спалучэннямі; выпісванне

словазлучэнняў з прыназоўнікамі; выбарачна-размеркавальнае спісванне ці дыктант з запісам прыназоўнікаў у адпаведнасці з паходжаннем ці будовай; падбор беларускіх адпаведнікаў да спалучэнняў з прыназоўнікамі рускай мовы; марфалагічны разбор прыназоўнікаў.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю прыназоўнікаў, разрады прыназоўнікаў па будове і паходжанні, правапіс прыназоўнікаў разам, праз злучок і асобна.

Умець:

распазнаваць у тэксце прыназоўнікі на аснове іх сэнсавых, марфалагічных і сінтаксічных прымет, вызначаць іх сэнсава-граматычную і стылістычную ролю; адрозніваць вытворныя прыназоўнікі ад самастойных часцін мовы, выконваць марфалагічны разбор прыназоўнікаў; правільна пісаць вытворныя прыназоўнікі, складаныя прыназоўнікі праз злучок; правільна ўжываць прыназоўнікі для перадачы розных сэнсавых адносін у сказе і тэксце, у тым ліку прыназоўнікі з (са), у (ва), па, згодна з, дзякуючы, падобна, адпаведна і іншыя прыназоўнікі; выкарыстоўваць спецыфічныя для беларускай мовы спалучэнні прыназоўнікаў з назоўнікамі, займеннікамі (у тым ліку пры перакладзе з рускай мовы); ужываць вытворныя прыназоўнікі з улікам іх стылістычнай дыферэнцыяцыі (вытворныя – пераважна ў публіцыстычным, афіцыйным і навуковым стылях); ствараць уласныя выказванні з мэтазгодным выкарыстаннем прыназоўнікаў рознай будовы і паходжання.

Валодаць:

нормамі правапісу простых, складаных і састаўных прыназоўнікаў, нормамі беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні ўласных выказванняў.

Злучнік
(5 гадзін, з іх 2 гадзіны – на навучальную пісьмовую работу)

Злучнік як службовая часціна мовы.

Простыя і састаўныя злучнікі, іх ужыванне.

Адзіночныя, парныя, паўторныя злучнікі, іх ужыванне і правапіс.

Злучальныя і падпарадкавальныя злучнікі, іх ужыванне.

Навучальнае сачыненне-апавяданне пра свой род, сваіх продкаў.

Віды дзейнасці: аналіз тэкстаў (у тым ліку на лінгвістычную тэму), вызначэнне ў іх ролі злучнікаў; падзел тэкстаў на сказы з пастаноўкай знакаў прыпынку; складанне сказаў, тэкстаў са злучальнымі і

падпарадкавальнымі злучнікамі; марфалагічны разбор злучнікаў; стварэнне паведамленняў на лінгвістычную тэму аб злучніку як службовай часціне мовы на аснове табліц і схем; стварэнне тэкстаў-апавяданняў пра свой род, сваіх продкаў.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю злучнікаў, разрады злучнікаў па будове, ужыванні і значэнні; правілы напісання злучнікаў разам і асобна.

Умець:

распазнаваць злучнікі ў тэкстах, вызначаць іх ролю; правільна выбіраць злучнікі (у адпаведнасці са значэннем і стылістычнай афарбоўкай), выконваць марфалагічны разбор злучнікаў; правільна ўжываць злучнікі ў сказах з аднароднымі членамі, у складаных сказах і для сувязі сказаў і частак тэксту; складаць тэксты з ужываннем розных злучнікаў; карыстацца паўторам злучніка з мэтай узмацнення выразнасці маўлення; ствараць тэксты-апавяданні пра свой род, сваіх продкаў.

Валодаць:

нормамі правапісу адзіночных, парных, паўторных злучнікаў, нормамі беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні тэкстаў-апавяданняў.

Часціца
(6 гадзін, з іх 2 гадзіны – на кантрольную пісьмовую работу)

Часціца як службовая часціна мовы. Асноўныя разрады часціц (азнаямленне).

Правапіс часціц.

Часціцы не, ні, іх адрозненне. Правапіс не (ня), ні з рознымі часцінамі мовы (паўтарэнне).

Кантрольнае сачыненне-разважанне на маральна-этычную тэму.

Віды дзейнасці: чытанне і аналіз тэкстаў, вызначэнне ў іх ролі часціц; складанне плана і пераказ лінгвістычнага тэксту з апорай на план; лінгвістычны эксперымент: параўнанне сказаў з часціцамі і без іх; пераклад выказванняў з рускай мовы на беларускую, характарыстыка ўжывання пытальных часціц у беларускай і рускай мовах; марфалагічны разбор часціц; стварэнне паведамленняў на лінгвістычную тэму аб часціцы як службовай часціне мовы на аснове табліц і схем; складанне схем (табліц) пра напісанне часціцы не са словамі розных часцін мовы; стварэнне тэкстаў-разважанняў на маральна-этычную тэму.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю (для формаўтваральных і адмоўных) часціц.

Умець:

распазнаваць часціцы ў тэксце, вызначаць іх ролю; складаць з імі сказы, ужываць у маўленні; захоўваць правільную інтанацыю пры чытанні сказаў з часціцамі; карыстацца часціцамі як сродкам сувязі частак тэксту; рабіць марфалагічны разбор часціц; ствараць тэксты-разважанні на маральна-этычную тэму.

Валодаць:

нормамі правапісу не (ня-), ні з рознымі часцінамі мовы, нормамі беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні тэкстаў-разважанняў.

Выклічнік
(1 гадзіна)

Выклічнік як часціна мовы. Злучок у выклічніках. Знакі прыпынку ў сказах з выклічнікамі.

Віды дзейнасці: складанне плана тэксту на лінгвістычную тэму, пераказ тэксту з апорай на план; інтанаванне сказаў з выклічнікамі; складанне сказаў, у якіх адзін і той жа выклічнік перадае розныя пачуцці; удзел у дыялогах з выкарыстаннем выклічнікаў этыкету.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы выклічніка.

Умець:

распазнаваць выклічнікі ў тэксце, вызначаць іх ролю; адрозніваць выклічнікі ад гукапераймальных слоў; правільна інтанаваць сказы з выклічнікамі, самастойна складаць новыя; дарэчы ўжываць выклічнікі ў маўленні.

Валодаць:

нормамі беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні ўласных выказванняў у вусным і пісьмовым маўленні.

Пераход слоў з адной часціны мовы ў іншую
(1 гадзіна)

Ужыванне слоў у ролі розных часцін мовы.

Віды дзейнасці: чытанне лінгвістычнага тэксту, складанне яго плана і пераказ па плане; вызначэнне, у ролі якіх часцін мовы выступаюць пэўныя словы; перабудова, складанне сказаў, каб прапанаваныя словы выступалі ў ролі іншых, чым у тэксце, часцін мовы; складанне і запіс уласных сказаў, каб словы выступалі ў ролі розных часцін мовы.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Мець уяўленне:

пра пераход слоў з адной часціны мовы ў іншую.

Умець:

складаць план тэксту, пераказваць тэкст па плане; вызначаць, у ролі якіх часцін мовы выступаюць словы ў сказах (тэксце); перабудоўваць, складаць сказы, каб прапанаваныя словы выступалі ў ролі іншых, чым у тэксце, часцін мовы; складаць і запісваць уласныя сказы, каб словы выступалі ў ролі розных часцін мовы.

Валодаць:

вывучанымі нормамі беларускай літаратурнай мовы пры пераказе тэксту, стварэнні ўласных выказванняў у вуснай і пісьмовай формах.

Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год
(2 гадзіны)

Асноўныя марфалагічныя прыметы вывучаных часцін мовы.

Віды дзейнасці: размеркаванне слоў у адпаведнасці з іх часцінамоўнай прыналежнасцю; вызначэнне пачатковай формы слоў вывучаных часцін мовы; утварэнне пэўных форм слоў; пераклад слоў (словазлучэнняў, сказаў, тэкстаў) з рускай мовы на беларускую; марфалагічны разбор вывучаных часцін мовы.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю, правапіс вывучаных часцін мовы.

Умець:

распазнаваць вывучаныя часціны мовы ў пачатковай і іншых формах на аснове іх сэнсавых, марфалагічных і сінтаксічных прымет; адрозніваць самастойныя часціны мовы ад службовых часцін мовы і выклічніка; правільна вымаўляць і пісаць вывучаныя часціны мовы ў адпаведнасці з правіламі ўтварэння і правапісу; вызначаць сэнсава-граматычную і стылістычную ролю вывучаных часцін мовы ў тэкстах, рабіць іх

марфалагічны разбор; правільна ўтвараць і ўжываць вывучаныя часціны мовы ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні; ствараць вусныя і пісьмовыя выказванні розных тыпаў і стыляў маўлення; перакладаць словы (словазлучэнні, сказы, тэксты) з рускай мовы на беларускую.

Валодаць:

нормамі ўтварэння і правапісу вывучаных часцін мовы; вывучанымі нормамі беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні ўласных выказванняў у вуснай і пісьмовай формах.

## VIII клас
(70 гадзін на год, 2 гадзіны на тыдзень, з іх 20 гадзін – на кантрольныя і навучальныя пісьмовыя работы, на напісанне якіх адводзяцца асобныя ўрокі; 1 гадзіна рэзервовая)

### Роля беларускай мовы ў развіцці нацыянальнай культуры
(1 гадзіна)

Мова як першааснова культуры, галоўны сродак зносін пакаленняў і грамадства.

### Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

стылявыя адметнасці беларускай мовы ў розных сферах камунікацыі; ролю беларускай мовы ў развіцці слоўнай творчасці.

Умець:

аргументавана выказваць сваю думку пра мову як нацыянальную каштоўнасць.

Валодаць:

нормамі беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні самастойных выказванняў.

### Тэкст
(1 гадзіна)

Тэкст і яго асноўныя прыметы (паглыбленае паўтарэнне). Паглыбленне паняцця пра паслядоўную і паралельную сувязі сказаў у тэксце, пра сродкі сувязі сказаў і частак тэксту.

Віды дзейнасці: чытанне тэкстаў розных тыпаў і стыляў маўлення, вызначэнне іх асноўных прымет (тэматычнае адзінства, разгорнутасць, паслядоўнасць, звязнасць, завершанасць); вусныя выказванні па тэорыі тэксту з апорай на лінгвістычныя тэксты вучэбнага дапаможніка.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

прыметы тэксту, віды спосабаў і сродкаў сувязі сказаў і частак тэксту.

Умець:

рабіць аналіз тэксту з вызначэннем яго прымет, спосабаў і сродкаў сувязі сказаў і частак тэксту.

Валодаць:

нормамі беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні самастойных выказванняў.

Паўтарэнне вывучанага ў V–VII класах
(2 гадзіны)

Самастойныя і службовыя часціны мовы. Правапіс не, ні з рознымі часцінамі мовы.

Віды дзейнасці: чытанне тэкстаў, вызначэнне іх тэмы, адрасата, мэтанакіраванасці і стылістычнай прыналежнасці; вусныя выказванні ў навуковым стылі пра вывучаныя часціны мовы з апорай на табліцы; марфалагічны разбор часцін мовы; тлумачальны дыктант (тлумачэнне правапісу не (ня-), ні з рознымі часцінамі мовы); падрабязны вусны пераказ тэксту.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

асноўнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю самастойных і службовых часцін мовы; правілы правапісу не (ня-), ні з рознымі часцінамі мовы.

Умець:

вызначаць асноўныя прыметы тэксту, яго стыль і тып; выяўляць у тэксце самастойныя і службовыя часціны мовы, рабіць іх марфалагічны разбор, правільна ўжываць у маўленні; правільна пісаць не (ня-), ні са словамі, тлумачыць іх правапіс.

Валодаць:

нормамі правапісу не (ня-), ні з рознымі часцінамі мовы, нормамі беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні самастойных выказванняў.

Стылі маўлення
(3 гадзіны, з іх 2 гадзіны – на навучальную пісьмовую работу)

Паглыбленне паняцця пра стылі маўлення. Стылеўтваральная роля самастойных і службовых часцін мовы.

Навучальны пераказ тэксту навуковага стылю (з выкарыстаннем апорных словазлучэнняў).

Віды дзейнасці: аналіз тэкстаў розных стыляў маўлення, характарыстыка моўных сродкаў і іх стылеўтваральнай ролі; абгрунтаванне прыналежнасці тэксту да пэўнага стылю; складанне тэкстаў рознай стылявой прыналежнасці з захаваннем асаблівасцей кожнага стылю; пераказ тэксту навуковага стылю (з выкарыстаннем апорных словазлучэнняў).

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

стылі маўлення і іх характэрныя прыметы.

Умець:

вызначаць ролю самастойных і службовых часцін мовы ў стварэнні тэкстаў розных стыляў маўлення; дакладна перадаваць змест тэксту навуковага стылю з захаваннем моўных сродкаў, характэрных для гэтага стылю.

Валодаць:

нормамі беларускай літаратурнай мовы пры пераказе тэксту навуковага стылю, стварэнні самастойных выказванняў.

Сінтаксіс і пунктуацыя
(1 гадзіна)

Асноўныя адзінкі сінтаксісу. Правілы пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказах (паўтарэнне).

Віды дзейнасці: гутарка пра асноўныя моўныя адзінкі і паняцці кожнага з раздзелаў мовазнаўства, асноўныя адзінкі сінтаксісу; чытанне і рэканструяванне тэкстаў (без знакаў прыпынку); пісьмовыя адказы на пытанні.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў.

Ведаць:

асноўныя адзінкі сінтаксісу (тэкст, сказ, словазлучэнне).

Умець:

вызначаць стыль і тып тэксту, яго асноўную думку; расстаўляць знакі прыпынку, тлумачыць іх ролю ў сказе.

Валодаць:

вывучанымі пунктуацыйнымі нормамі пры стварэнні пісьмовых выказванняў.

### Словазлучэнне: будова, значэнне, ужыванне (4 гадзіны)

Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка. Віды падпарадкавальнай сувязі ў словазлучэнні: дапасаванне, кіраванне, прымыканне. Асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове (у параўнанні з рускай). Свабодныя і несвабодныя словазлучэнні (азнаямленне).

Віды дзейнасці: класіфікацыя словазлучэнняў; разгортванне словазлучэнняў, іх выкарыстанне пры апісаннях прадметаў, людзей, з’яў; пераклад сказаў (тэкстаў) з адметнымі беларускімі словазлучэннямі; вызначэнне апорных словазлучэнняў у тэкстах, выяўленне іх сэнсава-стылістычнай ролі.

### Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

функцыі словазлучэння; віды падпарадкавальнай сувязі ў словазлучэнні: дапасаванне, кіраванне, прымыканне.

Умець:

знаходзіць словазлучэнні ў тэксце; вызначаць від падпарадкавальнай сувязі ў словазлучэнні; выяўляць галоўнае слова, групаваць словазлучэнні паводле будовы і значэння; ствараць і разгортваць словазлучэнні з рознымі відамі сінтаксічнай сувязі; перакладаць з рускай мовы на беларускую сказы (тэксты) з адметнымі беларускімі словазлучэннямі; адрозніваць свабодныя і несвабодныя словазлучэнні; выконваць сінтаксічны разбор словазлучэнняў.

Валодаць:

нормамі беларускай літаратурнай мовы пры перакладзе з рускай мовы на беларускую.

### Просты сказ

### Двухсастаўныя сказы: будова, значэнне, ужыванне (16 гадзін, з іх 3 гадзіны – на кантрольную і навучальную пісьмовыя работы)

Сказ як сінтаксічная адзінка, яго асноўная функцыя. Тыпы сказаў па мэце выказвання і інтанацыйным афармленні (апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя; клічныя і няклічныя сказы). Простыя і складаныя сказы.

Развітыя і неразвітыя сказы.

Парадак слоў у сказе. Лагічны націск (азнаямленне).

Двухсастаўныя сказы. Дзейнік і выказнік, сэнсава-граматычныя адносіны паміж імі.

Спосабы выражэння дзейніка. Спосабы выражэння выказніка (простага дзеяслоўнага, састаўнога дзеяслоўнага і састаўнога іменнага). Сувязь выказніка і дзейніка, выражанага колькасна-іменным спалучэннем. Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам.

Даданыя члены сказа: азначэнне, дапаўненне, акалічнасць; іх граматычнае значэнне. Спосабы выражэння даданых членаў сказа. Прыдатак як разнавіднасць азначэння.

Навучальны пераказ зместу кінафільмаў, урыўкаў з мастацкіх твораў, радыё- і тэлеперадач з выкарыстаннем двухсастаўных сказаў.

Кантрольны дыктант.

Віды дзейнасці: чытанне маналагічных і дыялагічных тэкстаў; падзел дэфармаваных тэкстаў на сказы, вызначэнне тыпу сказаў па мэце выказвання і інтанацыі; выяўленне сказаў, якія выражаюць асноўную думку ў тэксце, і тых, якія яе паясняюць; падрыхтоўка паведамлення на маральна-этычную тэму на аснове дзвюх-трох крыніц; перабудова неразвітых двухсастаўных сказаў у развітыя; чытанне і аналіз мастацкіх тэкстаў, вызначэнне ў іх сродкаў эмацыянальна-экспрэсіўнай выразнасці; спосабаў і сродкаў сувязі частак і сказаў; складанне двухсастаўных развітых сказаў на тэмы, звязаныя з працай людзей розных прафесій; напісанне тэкстаў на аснове складзеных сказаў; пераказ зместу кінафільмаў, урыўкаў з мастацкіх твораў, радыё- і тэлеперадач.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

тыпы простых сказаў; галоўныя і даданыя члены сказа, спосабы іх выражэння.

Умець:

выяўляць двухсастаўныя неразвітыя сказы ў тэкстах; рабіць сінтаксічны разбор двухсастаўных неразвітых сказаў; дзяліць дэфармаваны тэкст на сказы і абазначаць іх межы; вызначаць сказы, якія выражаюць асноўную думку ў тэксце, і тыя, якія яе паясняюць; правільна інтанаваць апавядальныя, пытальныя і пабуджальныя сказы; адрозніваць развітыя сказы ад неразвітых, вызначаць мэтазгоднасць ужывання іх у тэксце, перабудоўваць неразвітыя двухсастаўныя ў развітыя; знаходзіць галоўныя і даданыя члены сказа; характарызаваць найбольш пашыраныя спосабы выражэння дзейніка і выказніка, вызначаць простыя дзеяслоўныя, састаўныя дзеяслоўныя і састаўныя іменныя выказнікі; ставіць працяжнік

паміж дзейнікам і выказнікам; рабіць сінтаксічны разбор двухсастаўных развітых сказаў; правільна далучаць выказнік да дзейніка; складаць двухсастаўныя развітыя сказы на тэмы, звязаныя з працай людзей розных прафесій, аб'ядноўваць іх у тэксты з дапамогай паслядоўнай і паралельнай сувязяў; вызначаць у тэкстах сродкі эмацыянальна-экспрэсіўнай выразнасці; пераказваць змест радыё- і тэлеперадач з выкарыстаннем двухсастаўных сказаў; ствараць паведамленне на маральна-этычную тэму.

Валодаць:

нормамі спалучэння дзейніка і выказніка, нормамі беларускай літаратурнай мовы пры пераказе зместу радыё- і тэлеперадач з выкарыстаннем двухсастаўных сказаў, стварэнні паведамленняў на маральна-этычную тэму.

### Аднасастаўныя сказы: будова, значэнне, ужыванне (7 гадзін, з іх 4 гадзіны – на кантрольную і навучальную пісьмовыя работы)

Аднасастаўныя сказы. Віды аднасастаўных сказаў: пэўна-асабовыя, няпэўна-асабовыя, абагульнена-асабовыя, безасабовыя, назыўныя (азнаямленне).

Кантрольны падрабязны пераказ тэксту.

Навучальнае сачыненне з апісаннем з'яў прыроды.

Віды дзейнасці: знаходжанне ў тэкстах аднасастаўных развітых і неразвітых сказаў, вызначэнне іх сэнсава-стылістычнай ролі, абгрунтаванне мэтазгоднасці ўжывання; замена двухсастаўных сказаў сінанімічнымі аднасастаўнымі; пераклад з рускай мовы на беларускую мастацкага тэксту з апісаннем з'яў прыроды; стварэнне тэкстаў з апісаннем з'яў прыроды.

### Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

асноўныя прыметы аднасастаўных сказаў.

Умець:

выяўляць у тэкстах двухсастаўныя і аднасастаўныя сказы, адрозніваць іх па асноўных прыметах, складаць сказы з улікам сінаніміі двухсастаўных і аднасастаўных сказаў; ствараць вусныя і пісьмовыя разважанні з ужываннем аднасастаўных сказаў розных відаў; рабіць сінтаксічны разбор аднасастаўных сказаў; перакладаць з рускай мовы на беларускую тэксты з апісаннем з'яў прыроды; ствараць самастойныя тэксты з апісаннем з'яў прыроды.

Валодаць:

нормамі беларускай літаратурнай мовы пры перакладзе з рускай мовы на беларускую, стварэнні самастойных тэкстаў з апісаннем з'яў прыроды.

Няпоўныя сказы: будова, значэнне, ужыванне
(1 гадзіна)

Няпоўныя сказы. Працяжнік у няпоўным сказе.

Віды дзейнасці: параўнальны аналіз маналагічных і дыялагічных тэкстаў, вызначэнне сродкаў моўнай выразнасці; абмеркаванне пэўнай падзеі ў форме дыялогу; афармленне дыялогаў на пісьме.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

асноўныя прыметы няпоўных сказаў.

Умець:

выяўляць у тэкстах няпоўныя сказы, вызначаць іх будову, мэтазгоднасць ужывання; адрозніваць няпоўныя двухсастаўныя сказы ад поўных аднасастаўных; карыстацца няпоўнымі сказамі ў маналагічным і дыялагічным маўленні; рабіць сінтаксічны разбор няпоўных сказаў; афармляць няпоўныя сказы на пісьме ў адпаведнасці з пунктуацыйнымі нормамі.

Валодаць:

пунктуацыйнымі нормамі пры афармленні няпоўных сказаў на пісьме.

Ускладнены сказ
Сказы з аднароднымі членамі: будова, значэнне, ужыванне
(9 гадзін, з іх 4 гадзіны – на кантрольную і навучальную пісьмовыя работы)

Паняцце пра ўскладнены сказ. Сказы з аднароднымі членамі. Аднародныя і неаднародныя азначэнні. Знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі.

Сказы з абагульняльнымі словамі пры аднародных членах, знакі прыпынку.

Водгук на празаічны або вершаваны твор.

Кантрольнае сачыненне-разважанне на аснове прыказкі.

Віды дзейнасці: чытанне і аналіз тэкстаў з апісаннямі; вызначэнне ў іх сэнсава-стылістычнай ролі сказаў з аднароднымі членамі, у тым ліку з абагульняльнымі словамі, абгрунтаванне мэтазгоднасці ўжывання; напісанне водгуку на празаічны або вершаваны твор; стварэнне тэкстаў-разважанняў на аснове прыказкі (пра беларускія народныя звычаі і

традыцыі).

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

прыметы ўскладненага сказа, спосабы ўскладнення сказа; сродкі сувязі пры аднародных членах сказа і знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі.

Умець:

вызначаць сказы з аднароднымі членамі, звязанымі спалучальнымі, супраціўнымі і размеркавальнымі злучнікамі, у тым ліку сказы з абагульняльнымі словамі пры аднародных членах, правільна афармляць іх на пісьме; выкарыстоўваць сказы з аднароднымі членамі пры стварэнні пісьмовых тэкстаў; рабіць сінтаксічны разбор сказаў з аднароднымі членамі; пісаць водгук на празаічны або вершаваны твор; складаць тэкст-разважанне пра беларускія народныя звычаі і традыцыі.

Валодаць:

нормамі афармлення на пісьме сказаў з аднароднымі членамі, нормамі беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні самастойных выказванняў.

Сказы са зваротkамі, пабочнымі словамі, устаўнымі канструкцыямі: будова, значэнне, ужыванне
(8 гадзін, з іх 2 гадзіны – на кантрольную пісьмовую работу)

Зваротак. Неразвітыя і развітыя звароткі, іх выдзяленне ў вусным і пісьмовым маўленні.

Пабочныя словы, словазлучэнні і сказы, устаўныя канструкцыі; знакі прыпынку.

Кантрольны падрабязны пераказ тэксту.

Віды дзейнасці: чытанне лістоў знакамітых людзей, знаходжанне сказаў са звароткамі, пабочнымі словамі і выклічнікамі; вызначэнне іх сэнсава-стылістычнай ролі, абгрунтаванне мэтазгоднасці ўжывання; напісанне віншаванняў, афіцыйных пісьмаў і сяброўскіх лістоў.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

спосабы выражэння зваротка, асаблівасці пабочных і ўстаўных канструкцый; афармленне звароткаў, пабочных і ўстаўных канструкцый у вусным і пісьмовым маўленні.

Умець:

вызначаць сказы са звароткамі, пабочнымі словамі, правільна

інтанаваць іх, ужываць пры стварэнні вусных і пісьмовых тэкстаў розных стыляў, афармляць на пісьме; карыстацца пабочнымі словамі як сродкам сувязі сказаў і частак тэксту; рабіць сінтаксічны разбор сказаў са звароткамі, пабочнымі словамі, устаўнымі канструкцыямі; пераказваць апавядальныя тэксты з элементамі разважання; пісаць віншаванні, афіцыйныя пісьмы і сяброўскія лісты.

Валодаць:

нормамі афармлення на пісьме сказаў са звароткамі, пабочнымі словамі, устаўнымі канструкцыямі; нормамі беларускай літаратурнай мовы пры пераказе тэкстаў, стварэнні самастойных выказванняў.

Сказы з адасобленымі членамі: будова, значэнне, ужыванне
(13 гадзін, з іх 5 гадзін – на кантрольную і навучальныя пісьмовыя работы)

Паняцце пра адасабленне. Адасобленыя дапасаваныя і недапасаваныя азначэнні.

Сказы з адасобленымі прыдаткамі, знакі прыпынку.

Сказы з адасобленымі дапаўненнямі, знакі прыпынку.

Сказы з адасобленымі акалічнасцямі, знакі прыпынку.

Сказы з адасобленымі ўдакладняльнымі членамі, знакі прыпынку.

Кантрольнае сачыненне на маральна-этычную тэму.

Навучальнае сачыненне-апісанне помніка гісторыі (культуры).

Навучальная тэставая работа.

Віды дзейнасці: аналіз і пераказ мастацкіх тэкстаў на гістарычную тэму; вызначэнне сэнсава-стылістычнай ролі адасобленых членаў сказа, абгрунтаванне мэтазгоднасці іх ужывання; выяўленне ў тэкстах апісання гістарычнай падзеі; пераклад з рускай мовы на беларускую тэкстаў гістарычнай тэматыкі з элементамі апісання; стварэнне тэкстаў-апісанняў помніка гісторыі (культуры), тэкстаў-разважанняў на маральна-этычную тэму (пра прыгажосць чалавечых узаемаадносін); выкананне тэставай работы.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

прыметы адасобленых членаў сказа, умовы і правілы адасаблення.

Умець:

выяўляць у тэкстах сказы з адасобленымі членамі, вызначаць іх сэнсава-стылістычную ролю, абгрунтоўваць мэтазгоднасць ужывання; рабіць сінтаксічны разбор сказаў з адасобленымі членамі; карыстацца сказамі з адасобленымі членамі ў вусных і пісьмовых выказваннях,

правільна іх інтанаваць, ставіць знакі прыпынку; перакладаць з рускай мовы на беларускую тэксты гістарычнай тэматыкі; ствараць тэксты-апісанні помніка гісторыі (культуры); тэксты-разважанні пра прыгажосць чалавечых узаемаадносін.

Валодаць:

нормамі афармлення на пісьме сказаў з адасобленымі членамі; нормамі беларускай літаратурнай мовы пры перакладзе тэкстаў, стварэнні самастойных выказванняў.

Сказы з параўнальнымі зваротамі
(1 гадзіна)

Параўнальны зварот. Знакі прыпынку пры параўнальных зваротах.

Віды дзейнасці: выяўленне ў сказах і тэкстах параўнальных зваротаў, вызначэнне іх ролі ў маўленні; інтанаванне сказаў з параўнальнымі зваротамі, іх афармленне на пісьме.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

прыметы параўнальных зваротаў, правілы афармлення параўнальных зваротаў у пісьмовым маўленні.

Умець:

вызначаць сказы з параўнальнымі зваротамі, ужываць іх пры стварэнні вусных і пісьмовых выказванняў, правільна інтанаваць і ставіць знакі прыпынку; адрозніваць параўнальныя звароты ад аманімічных сінтаксічных канструкцый.

Валодаць:

нормамі беларускай літаратурнай мовы пры афармленні параўнальных зваротаў у пісьмовым маўленні.

Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год
(2 гадзіны)

Пунктуацыя простага сказа ў сучаснай беларускай літаратурнай мове.

Віды дзейнасці: каменціраванне арфаграм і пунктаграм у сказах (тэкстах); запіс сказаў (тэкстаў) з расстаноўкай знакаў прыпынку; вусныя выказванні на прапанаваную тэму; сінтаксічны разбор простых сказаў.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

пунктуацыю простага сказа.

Умець:

правільна пунктуацыйна афармляць пісьмовыя выказванні; рабіць сінтаксічны разбор простых сказаў; выяўляць і выпраўляць пунктуацыйныя памылкі ва ўласным і чужым маўленні; ствараць вусныя і пісьмовыя выказванні розных тыпаў і стыляў маўлення.

Валодаць:

вывучанымі пунктуацыйнымі нормамі пры стварэнні пісьмовых выказванняў.

## IX клас

(68 гадзін на год, 2 гадзіны на тыдзень, з іх 19 гадзін – на кантрольныя і навучальныя пісьмовыя работы, на напісанне якіх адводзяцца асобныя ўрокі; 1 гадзіна рэзервовая)

### Беларуская мова ў сям’і славянскіх моў і моў народаў свету (1 гадзіна)

Месца беларускай мовы ў сям’і славянскіх моў і моў народаў свету.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Мець уяўленне:

пра асаблівасці беларускай мовы ў параўнанні з іншымі славянскімі мовамі і мовамі народаў свету.

Умець:

вызначаць спецыфічныя фанетычныя, граматычныя і лексічныя рысы, якія адрозніваюць беларускую мову ад іншых славянскіх моў; перакладаць тэксты на беларускую мову, перадаючы яе адметныя рысы.

Валодаць:

нормамі беларускай літаратурнай мовы пры перакладзе тэкстаў на беларускую мову, стварэнні самастойных выказванняў.

### Тэкст (2 гадзіны)

Тэкст і яго асноўныя прыметы (паглыбленае паўтарэнне). Сінтаксічная сінаніміка.

Віды дзейнасці: чытанне тэкстаў, вызначэнне іх асноўных прымет (тэматычнае адзінства, разгорнутасць, паслядоўнасць, звязнасць, завершанасць); падзел тэкстаў на сказы і лагічныя часткі; вызначэнне сказаў, якія выражаюць асноўны сэнс паведамлення і якія яго пашыраюць;

разгортванне сэнсу частак шляхам далучэння самастойна складзеных сказаў; увядзенне ў тэкст новых частак; вызначэнне тэмы, адрасата і мэтанакіраванасці выказванняў, знаходжанне ў іх апорных слоў і словазлучэнняў; абгрунтаванне сэнсава-стылістычнай і тэкстаўтваральнай ролі сінтаксічных сінонімаў (просты сказ).

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

прыметы тэксту.

Умець:

вызначаць прыметы тэксту, спосабы і сродкі сувязі сказаў і частак тэксту; падбіраць сінтаксічныя сінонімы да розных сінтаксічных адзінак; ствараць тэксты рознай жанрава-стылістычнай прыналежнасці з выкарыстаннем сказаў рознай будовы і прызначэння.

Валодаць:

нормамі беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні самастойных вусных і пісьмовых выказванняў.

Паўтарэнне вывучанага ў V–VIII класах
(3 гадзіны)

Слова, словазлучэнне, сказ як асноўныя моўныя адзінкі. Тыпы простых сказаў па мэце выказвання, інтанацыйным афармленні (апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя; клічныя і няклічныя) і будове (двухсастаўныя, аднасастаўныя, няпоўныя, ускладненыя).

Віды дзейнасці: чытанне і аналіз тэкстаў розных стыляў і жанраў, выяўленне ў іх двухсастаўных, аднасастаўных, няпоўных і ўскладненых сказаў, вызначэнне іх сэнсава-стылістычнай ролі.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

асноўныя моўныя адзінкі, віды падпарадкавальнай сувязі, тыпы простых сказаў па структуры, мэце выказвання і інтанацыі.

Умець:

выяўляць у тэкстах сказы, якія выражаюць асноўную думку паведамлення, разгортваць словазлучэнні і сказы, рабіць пераклад словазлучэнняў у адпаведнасці з асаблівасцямі іх будовы ў беларускай мове; ставіць знакі прыпынку ў сказах ускладненай будовы; вызначаць тып тэкстаў, выяўляць у іх апорныя словы і словазлучэнні, сродкі сувязі сказаў і лагічных частак; ствараць выказванні з выкарыстаннем апорных слоў і

словазлучэнняў, пашыраць тэксты; рабіць сінтаксічны разбор простых сказаў.

Валодаць:

нормамі беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні самастойных вусных і пісьмовых выказванняў.

Стылі маўлення
(1 гадзіна)

Паглыбленне паняцця пра стылі маўлення. Стылеўтваральная роля марфалагічных і сінтаксічных моўных сродкаў.

Віды дзейнасці: аналіз тэкстаў розных стыляў маўлення, характарыстыка вывучаных моўных сродкаў і іх стылеўтваральнай ролі; абгрунтаванне прыналежнасці тэксту да пэўнага стылю; складанне тэкстаў рознай стылявой прыналежнасці з захаваннем асаблівасцей кожнага стылю.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

прыметы стыляў маўлення.

Умець:

вызначаць ролю марфалагічных і сінтаксічных моўных сродкаў у стварэнні тэкстаў розных стыляў маўлення; ствараць тэксты рознай жанрава-стылістычнай прыналежнасці з выкарыстаннем марфалагічных і сінтаксічных моўных сродкаў.

Валодаць:

нормамі беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні самастойных тэкстаў рознай жанрава-стылістычнай прыналежнасці.

Складаны сказ: будова, значэнне, ужыванне
(4 гадзіны, з іх 2 гадзіны – на кантрольную пісьмовую работу)

Паняцце пра складаны сказ. Сродкі сувязі частак у складаных сказах. Тыпы складаных сказаў.

Кантрольны падрабязны пераказ тэксту.

Віды дзейнасці: аналіз тэкстаў-разважанняў публіцыстычнага стылю; вызначэнне адрасата, тэмы, асноўнай думкі, асаблівасцей будовы і стылістычных прымет, падзел на лагічныя часткі, знаходжанне ў іх складаных сказаў, вызначэнне сродкаў сінтаксічнай сувязі граматычных частак; падрабязны пераказ тэксту.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

сінтаксічныя прыметы складаных сказаў; тыпы складаных сказаў.

Умець:

выяўляць у тэкстах складаныя сказы розных тыпаў; чытаць тэксты-разважанні публіцыстычнага стылю, выяўляць іх адрасата і мэтанакіраванасць, дзяліць на лагічныя часткі, ставіць знакі прыпынку на мяжы частак складаных сказаў; ствараць складаныя сказы розных тыпаў, уключаць іх ва ўласныя вусныя і пісьмовыя выказванні; рабіць падрабязны пераказ тэксту.

Валодаць:

нормамі беларускай літаратурнай мовы пры пераказе тэкстаў, стварэнні самастойных вусных і пісьмовых выказванняў.

Складаназлучаныя сказы: будова, значэнне, ужыванне
(7 гадзін, з іх 2 гадзіны – на навучальную пісьмовую работу)

Паняцце пра складаназлучаны сказ. Сродкі сувязі частак у складаназлучаных сказах. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназлучаных сказах.

Навучальнае сачыненне-апісанне па карціне.

Віды дзейнасці: перабудова простых сказаў з аднароднымі выказнікамі ў складаназлучаныя, складаназлучаных – у простыя; інтанаванне тэкстаў са складаназлучанымі сказамі; вызначэнне ролі складаназлучаных сказаў у тэкстах; стварэнне тэкстаў-апісанняў па карціне.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

сінтаксічныя прыметы складаназлучаных сказаў, сэнсавыя адносіны паміж часткамі, пунктуацыйныя нормы пры пісьмовым афармленні складаназлучаных сказаў.

Умець:

выяўляць складаназлучаныя сказы ў тэкстах, правільна інтанаваць, абгрунтоўваць мэтазгоднасць ужывання; састаўляць складаназлучаныя сказы, выкарыстоўваць іх у самастойных вусных і пісьмовых выказваннях, правільна інтанаваць і ставіць знакі прыпынку; перабудоўваць простыя сказы з аднароднымі выказнікамі ў складаназлучаныя, складаназлучаныя – у простыя; рабіць сінтаксічны разбор складаназлучаных сказаў; перакладаць тэксты лінгвістычнай тэматыкі з рускай мовы на беларускую, ствараць тэксты-апісанні карцін беларускіх мастакоў.

Валодаць:

пунктуацыйнымі нормамі пры пісьмовым афармленні складаназлучаных сказаў, нормамі беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні тэкстаў-апісанняў карцін беларускіх мастакоў.

### Складаназалежныя сказы: будова, значэнне, ужыванне (16 гадзін, з іх 5 гадзін – на кантрольную і навучальныя пісьмовыя работы)

Паняцце пра складаназалежны сказ.

Складаназалежныя сказы з даданай азначальнай, дапаўняльнай часткамі, акалічнаснай часткай месца, часу, умовы, прычыны, мэты, уступальнай, параўнальнай, спосабу дзеяння, меры і ступені (сродкі сувязі, знакі прыпынку).

Складаназалежныя сказы з некалькімі даданымі часткамі.

Складаназалежныя сказы з паслядоўным, сузалежным і змешаным падпарадкаваннем частак (азнаямленне), знакі прыпынку ў іх.

Навучальны падрабязны пераказ тэксту публіцыстычнага стылю.

Навучальнае сачыненне-разважанне на дыскусійную тэму ў публіцыстычным стылі.

Кантрольны дыктант.

Віды дзейнасці: чытанне тэкстаў, назіранне за парадкам частак у складаназалежных сказах, вызначэнне меж галоўнай і даданай частак, месца даданай часткі адносна галоўнай, інтанаванне і пастаноўка знакаў прыпынку; аналіз публіцыстычных тэкстаў, вызначэнне іх жанру (нататка, інтэрв’ю, рэпартаж), адрасата, мэтанакіраванасці, будовы, стылістычных прымет; перабудова простых сказаў з адасобленымі даданымі членамі ў складаназалежныя; пераклад з рускай мовы на беларускую тэксту публіцыстычнага стылю; пераказ тэкстаў публіцыстычнага стылю; стварэнне тэкстаў-разважанняў на дыскусійную тэму ў публіцыстычным стылі.

### Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

сінтаксічныя прыметы складаназалежных сказаў, сэнсавыя адносіны паміж часткамі, пунктуацыйныя нормы пры пісьмовым афармленні складаназалежных сказаў.

Умець:

выяўляць у тэкстах складаназалежныя сказы з рознымі відамі даданай часткі; складаць складаназалежныя сказы, выкарыстоўваць іх у вусным і пісьмовым маўленні, правільна інтанаваць і ставіць знакі прыпынку; перабудоўваць простыя сказы з адасобленымі членамі ў складаназалежныя;

рабіць сінтаксічны разбор складаназалежных сказаў; вызначаць жанр публіцыстычных тэкстаў (нататка, інтэрв'ю, рэпартаж), адрасата, мэтанакіраванасць, будову, стылістычныя прыметы; перакладаць з рускай мовы на беларускую тэксты публіцыстычнага стылю; пераказваць тэксты публіцыстычнага стылю; ствараць тэксты-разважанні на дыскусійную тэму ў публіцыстычным стылі.

Валодаць:

пунктуацыйнымі нормамі пры пісьмовым афармленні складаназалежных сказаў, нормамі беларускай літаратурнай мовы пры перакладзе тэкстаў з рускай мовы на беларускую, пераказе тэкстаў і стварэнні самастойных тэкстаў-разважанняў.

Бяззлучнікавыя складаныя сказы: будова, значэнне, ужыванне
(9 гадзін, з іх 2 гадзіны – на кантрольную пісьмовую работу)

Паняцце пра бяззлучнікавы складаны сказ (будова, сэнсава-граматычныя адносіны паміж часткамі, сродкі сувязі частак). Знакі прыпынку паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах.

Кантрольнае сачыненне-разважанне на дыскусійную тэму.

Віды дзейнасці: складанне бяззлучнікавых складаных сказаў рознай тэматыкі, іх інтанаванне, уключэнне ў тэксты ўласных паведамленняў; перабудова бяззлучнікавых складаных сказаў у простыя, складаназлучаныя і складаназалежныя, складаназлучаных і складаназалежных – у бяззлучнікавыя; аналіз мастацкіх і публіцыстычных тэкстаў: вызначэнне адрасата і адрасанта, тэмы паведамлення, мэтанакіраванасці; характарыстыка выяўленчых моўных сродкаў; абгрунтаванне мэтазгоднасці ўжывання бяззлучнікавых складаных сказаў; сінтаксічны разбор бяззлучнікавых складаных сказаў; стварэнне тэкстаў-разважанняў на дыскусійную тэму.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

сінтаксічныя прыметы бяззлучнікавых складаных сказаў, сэнсавыя адносіны паміж часткамі, пунктуацыйныя нормы пры пісьмовым афармленні бяззлучнікавых складаных сказаў.

Умець:

выяўляць бяззлучнікавыя складаныя сказы ў тэкстах, вызначаць сінтаксічныя адносіны паміж часткамі, інтанаваць сказы ў адпаведнасці з сэнсам, ставіць знакі прыпынку; дарэчы ўжываць бяззлучнікавыя складаныя сказы ў вусным і пісьмовым маўленні; выконваць сінанімічныя замены сказаў розных відаў; рабіць сінтаксічны разбор бяззлучнікавых

складаных сказаў; ствараць тэксты-разважанні на дыскусійную тэму.

Валодаць:

пунктуацыйнымі нормамі пры пісьмовым афармленні бяззлучнікавых складаных сказаў, нормамі беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні ўласных тэкстаў-разважанняў.

Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак: будова, значэнне, ужыванне
(10 гадзін, з іх 4 гадзіны – на навучальныя пісьмовыя работы)

Паняцце пра складаны сказ з рознымі відамі сувязі частак (разнавіднасці, сінтаксічныя прыметы, сродкі сувязі, інтанаванне і выкарыстанне). Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак.

Навучальнае сачыненне (аўтабіяграфія).

Навучальны сціслы пераказ тэксту (складанне тэзісаў, канспекта).

Навучальная тэставая работа.

Віды дзейнасці: знаходжанне складаных сказаў з рознымі відамі сувязі частак у тэкстах, складанне сказаў і ўвядзенне іх у тэкст; перабудова складаных сказаў з рознымі відамі сувязі частак у простыя, складаназлучаныя, складаназалежныя і бяззлучнікавыя; сінтаксічны разбор складаных сказаў з рознымі відамі сувязі частак; аналіз біяграфій беларускіх пісьменнікаў ці лінгвістаў, вызначэнне паслядоўнасці развіцця думкі ў залежнасці ад жанру і стылю тэкстаў; абгрунтаванне мэтазгоднасці выкарыстання выяўленчых моўных сродкаў, у тым ліку сказаў з рознымі відамі сувязі частак; напісанне заявы, аўтабіяграфіі; пераклад з рускай мовы на беларускую навукова-папулярных тэкстаў; складанне плана паведамлення, тэзісаў, канспекта, выступленне з дакладам, абмеркаванне выступленняў; выкананне тэставай работы.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

сінтаксічныя прыметы складаных сказаў з рознымі відамі сувязі частак, пунктуацыйныя нормы пры пісьмовым афармленні складаных сказаў з рознымі відамі сувязі частак.

Умець:

выяўляць у тэкстах складаныя сказы з некалькімі відамі сувязі частак, абгрунтоўваць мэтазгоднасць іх ужывання, складаць новыя сказы, карыстацца імі ў маўленні, ставіць знакі прыпынку; перабудоўваць сказы з рознымі відамі сувязі частак у сказы іншай граматычнай структуры; рабіць сінтаксічны разбор складаных сказаў з рознымі відамі сувязі частак; пісаць

заяву, аўтабіяграфію; рыхтаваць на аснове 2-3 крыніц паведамленне на лінгвістычную тэму: складаць план, тэзісы, канспект, выступаць перад аўдыторыяй; аналізаваць уласнае і чужое выказванне; перакладаць навукова-папулярныя тэксты з рускай мовы на беларускую; выконваць тэставую работу.

Валодаць:

пунктуацыйнымі нормамі пры пісьмовым афармленні складаных сказаў з рознымі відамі сувязі частак, нормамі беларускай літаратурнай мовы пры перакладзе тэкстаў з рускай мовы на беларускую, стварэнні ўласных вусных і пісьмовых выказванняў (заява, аўтабіяграфія), напісанні сціслых пераказаў (тэзісы, канспект), выкананні тэставай работы.

Сінтаксічныя канструкцыі з чужой мовай: будова, значэнне, ужыванне (9 гадзін, з іх 4 гадзіны – на кантрольныя пісьмовыя работы)

Спосабы перадачы чужой мовы.

Асаблівасці будовы сінтаксічных канструкцый з простай мовай. Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай.

Маналог. Дыялог, яго афармленне на пісьме.

Сказы з ускоснай мовай.

Цытаты, іх роля ў выказванні, афармленне на пісьме. Эпіграф.

Кантрольнае сачыненне пра родны край.

Кантрольны падрабязны пераказ тэксту.

Віды дзейнасці: аналіз публіцыстычных, мастацкіх і навуковых тэкстаў, вызначэнне ў іх чужой мовы, абгрунтаванне мэтазгоднасці ўжывання і спосабаў перадачы; замена ў тэкстах простай мовы на ўскосную і наадварот, стварэнне тэкстаў (маналогаў і дыялогаў), іх інтанаванне; падрыхтоўка тэкстаў дыскусійных выступленняў з цытаваннем першакрыніц; падрабязны пераказ тэксту, стварэнне ўласных выказванняў пра гісторыю і прыроду роднага краю.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

спосабы перадачы чужой мовы, асаблівасці будовы сінтаксічных канструкцый з чужой мовай, пунктуацыйныя нормы пры пісьмовым афармленні чужога выказвання.

Умець:

выяўляць у тэкстах канструкцыі з простай і ўскоснай мовай, інтанаваць іх, вызначаць асаблівасці будовы, выкарыстоўваць у маўленні, ставіць знакі прыпынку; карыстацца цытатамі ў адпаведнасці з мэтай і характарам выказвання; замяняць простую мову ўскоснай і наадварот; ствараць тэксты-

разважанні дыскусійнага характару, складаць тэксты пра гісторыю і прыроду роднага краю.

Валодаць:

пунктуацыйнымі нормамі пры пісьмовым афармленні канструкцый з простай і ўскоснай мовай, нормамі беларускай літаратурнай мовы пры падрыхтоўцы ўласных вусных і пісьмовых выказванняў.

### Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год
(5 гадзін)

Сінтаксіс як раздзел граматыкі, яго асноўныя адзінкі і іх характарыстыка. Узаемасувязь сінтаксісу, лексікі і марфалогіі.

Нормы літаратурнага вымаўлення. Паўтарэнне складаных пытанняў арфаграфіі і пунктуацыі.

### Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

асноўныя адзінкі сінтаксісу.

Умець:

выяўляць у тэкстах складаныя сказы розных тыпаў; ставіць знакі прыпынку на мяжы частак складаных сказаў; ствараць складаныя сказы розных тыпаў; пунктуацыйна правільна афармляць сказы з простай мовай.

Валодаць:

вывучанымі арфаэпічнымі, акцэнталагічнымі, лексічнымі, фразеалагічнымі, словаўтваральнымі, марфалагічнымі, сінтаксічнымі, арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы.